Беларуская Грэка-Каталіцкая (Уніяцкая) Царква
Сьвятых Апосталаў Пятра і Паўла ў Лёндане

# ВЯЧЭРНІЯ СЛУЖБЫ ВАСЬМІ ТОНАЎ НА ЎСЕ ДНІ ТЫДНЯ

Лёндан 1998

# ТОН ПЕРШЫ

## СУБОТА ЎВЕЧАРЫ

На "Госпадзе, Цябе клічу..." :

Вячэрнія нашы малітвы прымі, сьвяты Госпадзе, і дай нам адпушчэньне грахоў, бо Ты Адзіны, які паказаў сьвету ўваскрасеньне.

Абыдзіце, людзі, Сыён і абдыміце яго, і аддайце славу Таму, хто ў ім з мёртвых уваскрос, бо Ён Бог наш, які выбавіў нас ад беззаконьняў нашых.

Прыйдзіце, людзі, усхвалім у песьнях Хрыста і паклонімся Яму, бо Ён Бог наш, які выбавіў нас ад варожай маны.

Весяліцеся, нябёсы, загрыміце, асновы зямлі, горы, радасна ўсклікніце, бо вось Эмануэль грахі нашыя да крыжа прыбіў, жыцьцё дараваў і сьмерць умярцьвіў, і як Чалавекалюбец Адама ўзьняў.

Усхвалім у песьнях Таго, хто дзеля нас на крыжы расьпяты быў, цярпеў і быў пахаваны, і на трэці дзень з мёртвых уваскрос; усклікнем: "Умацуй у праўдзівай веры Царкву Тваю, Хрысьце, і як добры і Чалавекалюбец даруй жыцьцю нашаму супакой."

Стоячы перад Тваёй магілай, што зьмяшчала Жыцьцё, мы, недастойныя, прыносім хвалу невыказнай міласэрнасьці Тваёй, Хрысьце Божа наш, бо Ты, Бязгрэшны, крыж і сьмерць пацярпеў, хочучы як Чалавекалюбец дараваць сьвету ўваскрасеньне.

Беспачатнае і ўсюдыпрысутнае з Айцом Слова выйшла ў невыказны спосаб з дзявочага ўлоньня, крыж і сьмерць пацярпела і на трэці дзень уваскросла ў славе. Дык усхвалім Яго ў песьнях і ўсклікнем: "Слава Табе, Жыцьцядаўча Хрысьце, Збавіцелю душаў нашых!"

*Дагматык.* Сусьветную славу, што ад людзей нарадзілася і Ўладара нарадзіла, Дзьверы нябесныя, усхвалім Марыю Дзеву, анёлаў песьню і верных красу. Яна, стаўшыся небам і Боскім хорамам, зьнішчыла сьцяну варожасьці, устанавіла мір і адчыніла валадарства. Умацаваныя Ёю ў веры, мы знайшлі абаронцу ў Госпадзе, які нарадзіўся ад Яе. Дык сьмела, людзі Божыя, будзьце добрай думкі, бо Ён як усемагутны ворагаў перамог.

**Вершапесьні**

Мукамі Тваімі, Хрысьце, мы ад мукаў вызваліліся, і ўваскрасеньнем Тваім мы сталіся свабоднымі ад тленнасьці. Госпадзе, слава Табе!

*Верш.* Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу. Апрануўся Госпад у сілу і падперазаўся.

Хай радуюцца стварэньні, нябёсы хай цешацца, людзі хай весела пляскаюць у далоні: бо вось Хрыстос, наш Збавіцель, да крыжа прыгвазьдзіў грахі нашыя і, умярцьвіўшы сьмерць, дараваў нам жыцьцё, і паўшага праайца Адама ўзьняў як Чалавекалюбец.

*Верш.* Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца.

Ты, Уладару недасяжны неба і зямлі, дзеля чалавекалюбства даў сябе дабравольна прыбіць да крыжа. Пекла сустрэла Цябе ўнізе і сумелася, а праведнікі прынялі Цябе з радасьцю; і Адам усьцешыўся, убачыўшы Цябе — Творцу — ў падзямельлі. Што за цуд! Жыцьцё ўсіх пакаштавала сьмерці, каб прасьвятліць увесь сьвет, які ўсклікае: "Госпадзе, што ўваскрос з мёртвых, слава Табе!"

*Верш.* Дому Твайму належыцца сьвятасьць, Госпадзе, праз усе дні.

Жанчыны міраносіцы з духмянымі алейкамі, сьпяшаючыся, з плачам прыйшлі да магілы Тваёй. Не знайшоўшы там усячыстага цела Твайго і ад анёла пачуўшы пра новы і слаўны цуд, яны пайшлі абвясьціць апосталам, што Госпад уваскрос, даруючы сьвету багацьце свайго зьмілаваньня.

*Багародзічны.* Вось споўнілася прароцтва Ісаі: Дзева нарадзіла і пасьля родаў засталася, якой была раней. Бог быў Той, хто нарадзіўся ад Яе, і Ён адмяніў закон прыроды. Дык, Божая Маці, не пагардзі Тваімі слугамі, якія моляцца ў сьвятыні Тваёй, але, так як Ты насіла Міласэрнага на руках Тваіх, слугам Тваім спагадай і маліся за збаўленьне душаў нашых.

**Адпушчальны трапар уваскросны**

*Уваскросны.* Хоць юдэі запячаталі магільны камень і жаўнеры сьцераглі ўсячыстае цела Тваё, Ты ўваскрос на трэці дзень, Хрысьце Спасе, даруючы сьвету жыцьцё. Дзеля гэтага сілы нябесныя ўсклікнулі Табе, Жыцьцядаўча: "Слава ўваскрасеньню Твайму, Хрысьце, слава валадарству Твайму, слава провіду Твайму, адзіны Чалавекалюбча!"

## ПАРАДАК СЬПЯВАНЬНЯ АДПУШЧАЛЬНЫХ ТРАПРОЎ У СУБОТУ ЎВЕЧАРЫ

***Калі ёсьць трапар сьвятога:***

*Трапар уваскросны належнага тону;*
Слава...: *Трапар сьвятога.*
Цяпер...: *Багародзічны тону трапара **сьвятога** (гл. ст. 69).*

***Калі няма трапара сьвятога:***

*Трапар уваскросны належнага тону.*
Слава... цяпер...: *Багародзічны таго самага тону (гл. ст. 69).*

## НЯДЗЕЛЯ ЎВЕЧАРЫ

На "Госпадзе, Цябе клічу...":

У дабрыні Тваёй, Госпадзе, Ты ўсё прывёў да быцьця словам Тваім і Духам, і мяне стварыў разумнай істотаю, каб я славіў сьвятое імя Тваё. А я саромнымі ўчынкамі апаганіўся, але Ты пашкадуй мяне.

Пазнай, няшчасная душа мая, тваю боскую высакароднасьць і нятленную бацькаўшчыну, для якой ты прызначаная, і старайся асягнуць яе дабрадзейнасьцю; хай нішто дачаснае не палоніць цябе, бо тваё месца на вышынях, цела ж — зямля тленная. Дык хай ніжэйшае вышэйшым не кіруе.

Ідзі, няшчасная душа мая, да Ўсядобрага, з гарачымі сьлязьмі прыступіся да Яго і, перад тым як табе быць асуджанай, прызнайся ва ўсіх учынках тваіх і старайся, каб Творца быў міласэрным да цябе. Прасі прабачэньня перад тым, як Госпад зачыніць дзьверы табе.

*Багародзічны.* Марыя беззаганная, вышэйшая за ўсякі розум, Калясьніца пачэсная, магутным заступніцтвам Тваім накіруй на шырокі шлях пакаяньня мяне, апанаванага шматлікімі грахамі: Ты можаш усё, Маці Ўсемагутнага.

Вершапесьні

Быццам бездань марская, незьлічоныя мае бясчынствы, Збавіцелю, і я таплюся ў грахох; але Ты, Божа, працягні збавенную руку Тваю, як некалі Пятру, і зьмілуйся нада мною.

Мае паганыя думкі і благія ўчынкі асудзілі мяне, Збавіцелю, але Ты, Божа, дай мне духа каяньня, каб я мог усклікнуць Табе: "Збаў мяне, Дабрачынца мой, і зьмілуйся нада мною."

Малітвамі ўсіх сьвятых і Багародзіцы, даруй нам мір Твой і зьмілуйся над намі, бо ты адзіны Добры.

*Багародзічны.* Радасьць нябесных хораў і магутная Апякунка людзей на зямлі, Багародзіца Дзева! Збаў нас, якія прыбягаем да Цябе, Уладарка, бо пасьля Бога мы ўсклалі нашу надзею на Цябе.

## ПАНЯДЗЕЛАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Усё жыцьцё маё, Госпадзе, я, няшчасны, сорамна змарнаваў, і цяпер, як блудны сын, са скрухаю сардэчнаю клічу: "Ойча нябесны, зграшыў я, ачысьці і збаў мяне, і не адкінь мяне, які сам аддаліўся ад Цябе і, чынячы бясплодныя ўчынкі, зьбяднеў."

Багаты, Ты, Хрысьце, стаўся бедным, каб узбагаціць людзей несьмяротнасьцю і сьвятлом; дык і мяне, у асалодах жыцьцёвых зьбяднелага, узбагаць дабрадзейнасьцямі, дай мне ўдзел разам з убогім Лазарам і вызваль ад лёсу багача і пякель-нага агню, які чакае мяне.

Я вельмі багаты на ўсё благое, палюбіў раскошу і ў гэтым жыцьці атрымаў дабро, Госпадзе, і на агонь пякельны заслужыў, бо пагардзіў маім галодным розумам, быццам Лазарам, і пакінуў яго перад варотамі Тваіх боскіх дабрадзейнасьцяў. Але Ты, Госпадзе, зьмілуйся нада мною.

*Багародзічны.* Багародзіца Дзева, разам з Прадвесьнікам, які прапаведаваў усім Ягнё, што ўзяло на сябе грахі ўсяго сьвету, маліце Госпада, каб мне, нягоднаму, пазьбегнуць лёсу казлоў у судны дзень, але апынуцца ў ліку авечак па правай руцэ Яго.

**Вершапесьні**

Быццам бездань марская, незьлічоныя мае бясчынствы, Збавіцелю, і я таплюся ў грахох; але Ты, Божа, працягні збавенную руку Тваю, як некалі Пятру, і зьмілуйся нада мною.

Мае паганыя думкі і благія ўчынкі асудзілі мяне, Збавіцелю, але Ты, Божа, дай мне духа каяньня, каб я мог усклікнуць Табе: "Збаў мяне, Дабрачынца мой, і зьмілуйся нада мною."

Вашыя вызнаньні на судзе, сьвятыя, дэманаў запалохалі і вызвалілі людзей ад маны; калі вас забівалі, вы клікалі: "Няхай

ахвяра душаў нашых будзе прыемнай Табе, чалавекалюбны Госпадзе, бо мы, палюбіўшы Цябе, ня дбаем пра жыцьцё дачаснае."

*Багародзічны.* Майсей прароцкімі вачыма бачыў Цябе, Дзева ўсяхвальная, у вобразе незгаральнага куста, бо Боскі агонь не спаліў Твайго, Чыстая, улоньня. Дзеля гэтага просім Цябе, Маці Бога нашага, выпрасіць сьвету супакой і веліч зьмілаваньня.

## АЎТОРАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Прыбіты да крыжа як чалавек, Ты, Хрысьце Божа, абагавіў людзкую прыроду і начальніка зла ўмярцьвіў; вызваліўшы нас ад праклёну, што прыйшоў ад дрэва, у добрасардэчнасьці Тваёй Ты сам узяў на сябе праклён, і дараваў сьвету блаславеньне і веліч зьмілаваньня.

Вышэйшы за ўсё пачэснае, Ты, добры Уладару, дазволіў сябе абясславіць, пацярпеўшы на дрэве ганебную сьмерць, а род людзкі атрымаў несьмяротнасьць і першаснае жыцьцё, калі Ты, Усемагутны, целам памёр.

Крыжу пачэсны, верных ачышчэньне, уладароў сіла, асьвяці ўсіх, што пакланяюцца табе і славяць Хрыста, які ў невыказнай добрасардэчнасьці сваёй усячыстыя рукі расьцягнуў на табе і сабраў у адно ўсе канцы зямлі.

*Крыжабагародзічны.* Калі Ты, Чыстая Маці, убачыла СынаТвайго і Ўладара, які на крыжы рукі расьцягнуў і быў прабіты кап'ём у бок, Ты з плачам усклікнула: "Гора мне! Як гэта церпіш Ты, Чалавекалюбча, які адымаеш цярпеньні ад людзей?"

**Вершапесьні**

Крыж, пастаўлены на чэрапавым месцы, несьмяротнасьць нам прарасьціў з крыніцы невычэрпнай — боку Збавіцеля.

Крыж пачэсны Збавіцеля — непарушная сьцяна для нас усіх, бо, спадзеючыся на яго, атрымліваем збаўленьне.

Добрая купля вашая, сьвятыя, бо, даўшы вашую кроў, вы сталіся спадкаемцамі нябесных дабротаў і, дачасна пацярпеўшы, атрымалі вечную радасьць. Сапраўды добрая вашая купля, бо, пакінуўшы тленнае, вы атрымалі ўзамен нятленнае і, цешачыся разам з анёламі, няспынна славіце Тройцу адзінасутную.

*Крыжабагародзічны.* Калі беззаганая Дзева ўбачыла Цябе, Збавіцелю, узьнесенага на крыжы, Яна з плачам усклікнула: "Гора мне, мілае Дзіця маё! Што здарылася, і як гэта Ты, які трымаеш усё рукою Тваёю, быў прыбіты цялесна да дрэва?"

## СЕРАДА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Слаўныя апосталы, Богам пакліканыя вучні Хрыстовыя, настаўнікі сусьветныя, вы, знайшоўшы Госпада, пасрэдніка між Богам і людзьмі, да Яго прысталі і прапаведавалі Яго па ўсім сьвеце як дасканалага Бога і Чалавека.

Мудрыя апосталы, Богам пакліканыя вучні Хрыстовыя, настаўнікі сусьветныя, малітвамі сваімі ўмацуйце мяне на слуханьне вашых боскіх навучаньняў і памажыце хадзіць заўсёды вузкай сьцежкаю, каб дайсьці да прасторнага райскага жыльля.

Слаўлю Пятра першапасаднага, Паўла, Якуба, Андрэя і Піліпа, Сымона, Баўтрамея і Тамаша, а таксама Мацьвея і Яна, Марка і Луку, —пісцоў дабравешчаньня, — увесь Богам выбраны хор апосталаў, а з імі і семдзесят вучняў, сьведкаў і прапаведнікаў Слова.

*Багародзічны.* Топячыся ў моры правінаў, прыбягаю да ціхага прыстанішча малітвы Тваёй, Багародзіца,і клічу: "Працягні слузе Твайму моцную руку Тваю, Усебеззаганная, і збаў мяне!"

**Вершапесьні**

Натхнёнае Сьвятым Духам апостальскае велічнае навучаньне паганыя ахвяры бесаў адмяніла прапаведаваньнем адзінага Госпада, выбавіла народы ад ідальскай спакусы і навучыла пакланяцца адзінасутнай Тройцы .

Пятра і Паўла ўсяхвальных, Лукаша, Марка, Мацьвея, Яна, Андрэя, Тамаша, Баўтрамея, Сымона Кананіта, Якуба і Піліпа і ўсю грамаду вучняў належна ў песьнях уславім.

Усяхвальныя мучанікі, вас зямля не змагла ўтрымаць, а неба, адчыніўшы райскія дзьверы, прыняла вас, і вы, увайшоўшы, спажываеце ў асалоду з дрэва жыцьця. Маліце Хрыста даць душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

*Багародзічны.* Багародзіца Дзева і Нявеста, што мужа ня знала, Ты ў апошні час нарадзіла Бога і пасьля родаў засталася чыстай Дзеваю; Ты — пасад і брама, і застольле тайнае, і сьветач прамяністы.

## ЧАЦЬВЕР УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Калі Ты, Хрысьце, на крыжы распасьцёр рукі Твае, Ты паклікаў да сябе тых, што былі далёка, і даў ім месца побач з сабою. Дык малюся Табе, прымі мяне, палоненага благімі нахіламі, дай мне жаль за грахі і ачысьці нечысьць пажадлівасьцяў.

Ты, чалавекалюбны Хрысьце, распасьцёр на дрэве чыстыя рукі Твае з акрываўленымі пальцамі, каб выбавіць творы боскіх рук Тваіх, што знаходзіліся ў палоне з-за праступку Адама, якога Ты, Усемагутны, узьняў сілаю Тваёю.

Ты, Збавіцелю, цярпеў за нас мукі, хоць, як Бог, Ты прыродна нязьменны і непадуладны цярпеньням. Бязгрэшны, Ты, спрадвечны Хрысьце, быў расьпяты са злачынцамі. Сонца памеркла, бо не змагло цярпець такога зьдзеку, а зямля захісталася, пазнаўшы ў Табе Творцу сьвету.

*Крыжабагародзічны.* "Калі Ты, салодкае Дзіця маё,пакаштаваў жоўці і быў узьнесены на дрэве, Ты зрабіў салодскім горкі смак Адамавай стравы. Цяпер, як праведны судзьдзя, зрабі салодкім жыцьцё маё, Уладару, уваскросшы, як усемагутны, пасьля збавенных мукаў Тваіх", — Дзева казала з плачам.

**Вершапесьні**

Крыж, пастаўлены на чэрапавым месцы, несьмяротнасьць нам прарасьціў з крыніцы невычэрпнай — боку Збавіцеля.

Пачэсны Крыж Збавіцеля — непарушная сьцяна для нас усіх, бо, спадзеючыся на яго, атрымліваем збаўленьне.

Малітвамі ўсіх сьвятых і Багародзіцы, Хрысьце, даруй супакой Твой усім нам і зьмілуйся над намі, бо Ты адзіны добры і міласэрны.

*Крыжабагародзічны.* Калі Дзева ўбачыла Тваю неправедную сьмерць, Хрысьце, Яна з плачам усклікнула: "Дзіця маё наймілейшае, як гэта Ты несправядліва церпіш, як на дрэве вісіш Ты, што

**зямлю на водах павесіў? Малюся Табе, Дабрадзею шматміласэрны, не пакінь адзінокаю мяне, Маці і слугу Тваю."**

## ПЯТНІЦА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Сьвяточныя хоры мучанікаў струменямі крыві сваёй патапілі безьліч дэманаў, адмянілі саромныя ахвяры, зьнішчылі ідальскую спакусу і сёньня моляць Хрыста дараваць душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

Сьветлыя пастыры мудрымі словамі і настаўленьнямі навучылі нас славіць Бога ў Тройцы адзінага, ня зьмешваючы і не разьдзяляючы Боскіх асобаў. Цяпер яны моляцца за супакой і зьмілаваньне душаў нашых.

Хоры сьвятых посьнікаў усьпілі цялесныя пажаданьні, абуздалі прыродныя нахілы і паказаліся ў гэтым жыцьці роўнымі анёлам. Сёньня яны жывуць у радасьці ў нябесных сялібах і моляць Хрыста даць душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

*Дагматык.* Сусьветную славу... (*Гл. ст. 3*)

**Вершапесьні**

Слаўныя мучанікі, вас зямля не змагла ўтрымаць, а неба, адчыніўшы райскія дзьверы, прыняло вас, і вы, ўвайшоўшы туды, спажываеце ў асалоду з дрэва жыцьця. Маліце Хрыста даць душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

Малітвамі ўсіх сьвятых і Багародзіцы, Хрысьце, даруй супакой Твой усім нам і зьмілуйся над намі, бо Ты адзіны добры і міласэрны.

Вашыя вызнаньні на судзе, сьвятыя, дэманаў запалохалі і вызвалілі людзей ад маны; калі вас забівалі, вы клікалі: "Няхай ахвяра душаў нашых будзе прыемнай Табе, чалавекалюбны Госпадзе, бо мы, палюбіўшы Цябе, ня дбаем пра жыцьцё дачаснае."

*Багародзічны.* Сапраўды вышэй за розум тайна сынараджэньня Твайго, Нявеста Божая: усе прарокі прапаведавалі слаўнае і невыказнае зачацьце Тваё, Усяхвальная, і нараджэньне Сына Твайго, якім Ён збавіў сьвет.

# ТОН ДРУГІ

## У СУБОТУ ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Прыйдзіце, паклонімся Божаму Слову, народжанаму спрадвеку ад Айца і ад Дзевы цела прыняўшаму. Ён, пацярпеўшы на крыжы і аддаўшы сябе на пахаваньне, як захацеў, уваскрос з мёртвых і збавіў мяне, заблуднага чалавека.

Хрыстос Спас наш адмяніў прысуд на нас, прыбіўшы яго да крыжа, і зьнішчыў сьмерці ўладу. Пакланяемся Ягонаму трохдзённаму ўваскрасеньню.

З арханёламі ўславім уваскрасеньне Хрыстова, бо Ён — Збаўца і Вызваліцель душаў нашых, і ў славе страшнай і вялікай сіле зноў прыйдзе судзіць сьвет, які Ён стварыў.

Цябе, расьпятага і пахаванага, анёл назваў Уладаром і жанчынам сказаў: "Хадзеце, гляньце, дзе Госпад ляжаў, бо Ён, усемагутны, уваскрос, як прадказаў." Дзеля гэтага пакланяемся Табе, адзінаму несьмяротнаму. Жыцьцядаўча Хрысьце, зьмілуйся над намі.

Крыжом Тваім Ты адмяніў райскага дрэва праклён, і пахаваньнем Тваім Ты зьнішчыў сьмерці ўладу, і ўваскрасеньнем Тваім Ты прасьвятліў род людзкі. Дзеля гэтага ўсклікаем Табе: "Дабрачынца Хрысьце Божа наш, слава Табе!"

Адчыніліся перад Табою, Госпадзе, са страхам вароты сьмерці, і вартаўнікі пякельныя, убачыўшы Цябе, спалохаліся, бо Ты разбурыў медныя вароты і зламаў жалезныя замкі і, разьбіўшы нашыя аковы, вывеў нас з цемры і ценю сьмерці.

З песьняй вызваленьня на вуснах пойдзем усе да дому Гасподняга і паклонімся там, кажучы: "Госпадзе, што быў расьпяты, і з мёртвых уваскрос, і прабываеш ва ўлоньні Айца, ачысьці грахі нашыя!"

*Дагматык.* Цень Закону мінуў з прыйсьцем ласкі: як некалі куст, ахоплены агнём, не згараў, так і Ты, Дзева, пасьля родаў дзеваю засталася; замест слупа вогненнага Сонца праведнае зазьзяла; замест Майсея — Хрыстос, Збавіцель душ нашых.

**Вершапесьні**

Уваскрасеньнем Тваім, Хрысьце, Ты прасьвятліў увесь сусьвет і паклікаў да сябе ўсё стварэньне. Госпадзе ўсемагутны, слава Табе!

*Верш.* Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу. Апрануўся Госпад у сілу і падпераzаўся.

Дрэвам крыжовым, Хрысьце, Ты адмяніў праклён дрэва райскага, і пахаваньнем Тваім Ты зьнішчыў сьмерці ўладу, і прасьвятліў род наш уваскрасеньнем Тваім. Дзеля гэтага славім Цябе, усклікаючы: "Жыцьцядаўча Хрысьце, Божа наш, слава Табе!"

*Верш.* Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца.

Калі Ты, Хрысьце, павіс на крыжы, уся краса стварэньня памеркла; жаўнеры паказалі нялюдзкасьць сваю, прабіўшы кап'ём бок Твой; і гэбрэі, ня ведаючы Тваёй сілы, дамагаліся паставіць пячаці на магіле Тваёй. Але дзеля бязьмежнай міласэрнасьці, якую маеш у сэрцы Тваім, Ты прыняў пахаваньне і на трэці дзень уваскрос. Госпадзе, слава Табе!

*Верш.* Дому Твайму належыцца сьвятасьць, Госпадзе, праз усе дні.

Жыцьцядаўча Госпадзе, Ты дабравольна пацярпеў мукі дзеля нас, сьмяротных, і зышоў да пекла ў сіле. Там, быццам ад лютага зьвера, Ты выхапіў тых, што чакалі Цябе, і даў ім на жыльлё замест пекла рай. І нам, якія славім трохдзённае ўваскрасеньне Тваё, даруй адпушчэньне грахоў і багацьце зьмілаваньня Твайго.

*Багародзічны.* Новы цуд, большы за ўсе ранейшыя цуды! Хто калі бачыў Маці, якая радзіла бяз мужа і на руках насіла Таго, хто трымае ўсё стварэньне? З Божай волі радзіўся Той, каго Ты, Усячыстая, насіла як дзіцятка на руках Тваіх. З матчынай сьмеласьцю не пераставай маліць Яго за тых, што шануюць Цябе, каб Ён дараваў багацьце ласкі сваёй і збавіў душы нашыя.

**Адпушчальны трапар уваскросны**

***Увага:** Спосаб сьпяваньня трапароў у суботу ўвечары гл. ст. 5.*

*Уваскросны.* Калі Ты зышоў да сьмерці, Жыцьцё несьмяротнае, Ты зьнішчыў пекла зьзяньнем боскасьці Тваёй; калі ж Ты і памёрлых з апраметнай уваскрасіў, усе сілы нябесныя ўсклікнулі: "Жыцьцядаўча Хрысьце Божа наш, слава Табе!"

## НЯДЗЕЛЯ ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Ойча добры, Сыне-Слова Айца і Духу Сьвяты, адзіная няствораная існасьць: Ты — крыніца дабра, з якой цякуць струмені ласкаў і міласэрнасьці. Прымі нашыя малітвы і просьбы, і як адзіны шчодры і чалавекалюбны Бог дай нам, грэшным, прабачэньне.

Сэрца Тваё, уласьцівае Тваёй Боскай прыродзе, поўнае спагады, міласэрнасьці і ласкі. Дзеля гэтага молім Цябе, Хрысьце Збавіцелю наш, і, прыпаўшы да Цябе, клічам і просім: "Як добры і чалавекалюбны Бог дай слугам Тваім адпушчэньне шматлікіх правінаў і прабачэньне ўсяго, што мы зграшылі."

Каб збавіць усіх людзей, Ты, Збавіцелю, будучы Богам, дзеля нас прыняў цела і стаўся чалавекам. Збаў нас, якія шануем запаветы Твае, бо Ты, Чалавекалюбча, як ласкавы і міласэрны Бог, прыйшоў збавіць ласкаю Боскага хрышчэньня ня толькі праведнікаў, але і нас, скаваных безьліччу правінаў.

*Багародзічны.* Хоры анёлаў славяць тройчы сьвятымі песьнямі Сына Твайго, Усячыстая. Ты была Ягоным вогненным пасадам, адухоўленым хорамам і мастом Боскім, які вядзе з зямлі да Яго. Разам з арханёлам Габрыелем мы ўсе згодна клічам: "Радуйся, Поўная ласкі!", бо Ты нарадзіла Крыніцу жыцьця.

**Вершапесьні**

Зграшыў я перад Табою, Хрысьце Спасе, як блудны сын. Але Ты, Ойча, прымі мяне, які каюся, і зьмілуйся нада мною.

Быццам мытнік, Хрысьце Збавіцелю, клічу моцным голасам: "Ачысьці мяне, Божа, як некалі яго, і зьмілуйся нада мною!"

Божыя пакутнікі, што не палюбілі зямной уцехі, удастоіліся нябесных дабротаў і сталіся суграмадзянамі анёлаў. Малітвамі іх, Госпадзе, зьмілуйся нада мною і збаў мяне.

*Багародзічны.* Радуйся, Марыя Багародзіца, хорам непарушны і сьвяты, як кліча прарок: "Хорам Твой сьвяты, дзіўны ў справядлівасьці."

## ПАНЯДЗЕЛАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Я пераўзышоў усіх грахамі, дык як цяпер навучуся пакаяньню? Калі буду ўздыхаць, як мытнік, баюся абцяжыць неба; калі заплачу, як блудніца, сьлязьмі апаганю зямлю. Але Ты, Божа, дай мне адпушчэньне грахоў і зьлітуйся нада мною.

Я ўчыніў усякі грэх, усіх пераўзышоў у блудзе, і ня маю струменяў сьлёз, каб пакаяцца; калі далей буду жыць у ленасьці, буду асуджаны на мукі. Але Ты, адзіны добры Божа, дай мне паправу і зьмілуйся нада мною.

У дабрыні Тваёй, Хрысьце Госпадзе мой, дай мне сьлёзы жалю, каб мне плачам абмыць бруд правінаў маіх, спрычыненых няўстрыманасьцю, і стаць перад Табою ачышчаным, калі зыдзеш зноў з нябёсаў судзіць людзей, як адзіны праведны Судзьдзя.

*Багародзічны.* Прыродным сваяцтвам і згоднай малітваю вы адзінадушныя, Маці Уладара ўсіх і боскі Прадвесьніку; дык учыніце разам малітву за слугу вашага, які моцна прагневаў Усеміласэрнага, каб Ён, прыхіліўшыся да вашых малітваў, паказаў сваю спагадлівасьць і збавіў мяне, і вызваліў ад вогненнага сваяцтва.

**Вершапесьні**

Зграшыў я перад Табою, Хрысьце Спасе, як блудны сын. Але Ты, Ойча, прымі мяне, які каюся, і зьмілуйся нада мною.

Быццам мытнік, Хрысьце Збавіцелю, клічу моцным голасам: "Ачысьці мяне, Божа, як некалі яго, і зьмілуйся нада мною."

Малітвамі сьвятых мучанікаў і ўслаўленьнем Хрыста ўсякая мана разьвейваецца, і род людзкі вераю збаўляецца.

*Багародзічны.* Непраходная брама, таемна запячатаная, Багародзіца Дзева, прымі нашыя малітвы і занясі іх да Сына Твайго і Бога, каб Ён Табою збавіў душы нашыя.

## АЎТОРАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Калі Ты, Слова, памёр на крыжы, сьветачы нябесныя памерклі, зямля захісталася, камяні патрэскаліся, заслона царкоўная разарвалася, магілы паадчыняліся і мёртвыя ўсталі, пекла

выевергла ўсіх, што былі ў апраметнай, бесы былі пераможаныя, а сьмерць здалася ўсім сном.

Калі добры разбойнік убачыў Цябе, Хрысьце, як Ты вісеў на крыжы, быццам пладавітая вінаградная гронка, ён паказаў разважлівасьць і адным малым воклікам здабыў прабачэньне правінаў. Дык будзьма ягонымі пераймальнікамі і ўсклікнем: "Успомні, Чалавекалюбча, і нас у валадарстве Тваім!"

Боскі крыж Твой, Хрысьце, зьзяе ў Царкве, быццам зорка на небе, ён паліць бесаў, прасьвятляе верных, і пакрывае сорамам тых, што расьпялі Цябе, чыіх прабацькоў Ты некалі крыжападобным дрэвам вызваліў з няволі і даў ім у пустыні есьці мёд са скалы.

*Крыжабагародзічны.* "Зьзяньне сьветачаў нябесных памеркла, пераможанае духоўным Зьзяньнем, што зьявілася на крыжы; бо горшае перамагаецца лепшым, і большаму меншае ўступае месца; Дык ці ж не належала схавацца сьвятлу рэчыўнаму, калі зазьзяў Хрыстос?" — гледзячы на Цябе, Сьвятло сьвету, казала Усячыстая.

Вершапесьні

Хрысьце Спасе, які збавіў Пятра ў моры, збаў мяне сілаю крыжа Твайго і зьмілуйся нада мною.

"Хай будзе расьпяты!" — крычалі тыя, што раней карысталіся з дароў Тваіх, і забойцы праведнікаў прасілі сабе разбойніка замест Дабрачынца; але Ты, Хрысьце, маўчаў і ціха пераносіў іхнюю злосьць, жадаючы пацярпець і збавіць нас у чалавекалюбстве Тваім.

Хоры мучанікаў супрацівілся мучыцелям сваім, кажучы: "Мы — воі Ўладара сілаў! І хоць аддасьцё нас на агонь і мукі, не адрачэмся Тройцы."

*Крыжабагародзічны.* Калі Ты, Усячыстая, убачыла расьпяцьце Сына і Бога Твайго, Ты адчула насьцерпны боль і з плачам ускікнула: "Гора мне, Дзіця наймілейшае, як гэта Ты несправядліва церпіш, каб збавіць сыноў Адама?" Мы ж, Усячыстая Дзева, з вераю просім Цябе: "Малі Яго, каб Ён быў спагадлівым да нас."

## СЕРАДА ЎВЕЧАРЫ

На "Госпадзе, Цябе клічу...":

Быццам рэкі, што, разьдзяліўшыся, выплылі з раю, вы, мудрыя апосталы, напаілі ўсю зямлю. Зараўшы яе, вы пасеялі збавеннае прапаведаньне і зжалі буйнае калосьсе — душы збаўленых, якія вы, вучні Гасподнія, захавалі ў скарбніцы духоўнай, як найбольшы скарб.

Ад цемры пажадлівасьцяў і спакусаў шматпакутнае маё сэрца вызвальце, сьветачы духоўнага сьвітаньня і сьветлыя настаўнікі, што абвяшчаеце ўсім Сонца, якое разганяе спакусу ночы няверства. Як Ягоныя сьведкі, маліцеся, каб Ён прасьвятліў і нашыя розумы і пачуцьці.

Вы, сьведкі тайны, зьявіліся сапраўды боганапісанымі таблiцамі новай ласкі і кнігамі духоўнымі, якія маюць у сабе збавеннае слова, напісанае Духам і пальцам Айца; абышоўшы ўсю зямлю, вы навучылі ясна людзей праўдзівай веры і паказалі ім сьцежку да неба.

*Багародзічны.* Слова, роўнае славаю з Айцом і Духам, што, быццам вялікае сонца, у апошнія дні на зямлі зазьзяла ад Дзевы Божай Нявесты, паслала вас, слаўныя апосталы, быццам зоркі, сьвятлом веры прасьвятліць ўсіх людзей, што жывуць у цемры спакусы, і прывесьці іх да праўдзівай веры.

Вершапесьні

Ты, Збавіцелю, узьвялічыў па ўсім сусьвеце імёны найвышэйшых апосталаў, бо яны, навучыўшыся нябесным справам, аздараўлялі людзей, і нават іхні цень лячыў немачы; рыбакі чынілі цуды і пакліканыя сярод юдэяў прапаведавалі ласку. Малітвамі іх, Міласэрны, даруй нам веліч Твайго зьмілаваньня.

Будучы заўжды пад націскам няправедных учынкаў, прыбягаем да Цябе, сапраўднага Бога і, маючы за заступнікаў вучняў Тваіх, молімся: "Збаў нас, Настаўнік, бо гінем! Пакажы ворагам нашым, што Ты ахоўваеш людзей Тваіх і збаўляеш нас ад бедаў малітвамі апосталаў, не зважаючы на грахі нашыя, у вялікай Тваёй дабрыні." Госпадзе, Слава Табе.

Вялікую славу здабылі вы, сьвятыя: ня толькі цярпеньнямі вы перамаглі ворага, але і пасьля сьмерці праганяеце злых духаў, аздараўляеце немачы, лекары душаў і целаў. Маліцеся Госпаду за збаўленьне душаў нашых.

*Багародзічны.* Быццам пладавітае аліўнае дрэва, Дзева ўзрасьціла Цябе, Плод жыцьцядайны, каб прыносіў сьвету веліч і багацьце зьмілаваньня.

## ЧАЦЬВЕР УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Калі Ты, Збавіцелю, быў прыбіты да крыжа, сонца памеркла ад страху, заслона царкоўная разарвалася, зямля захісталася, камяні патрэскаліся, ня ў змозе бачыць, як Творца іхні і Бог з уласнае волі церпіць на дрэве несправядлівыя мукі і зьнявагі ад беззаконных.

Паваленыя на зямлю, параненыя страшным падзеньнем, ляжыць хітры зьмей, пераможаны расьпяцьцем Тваім, Чалавекалюбча. Адам ад праклёну вызваляецца, і збаўляецца раней асуджаны. Дзеля гэтага молімся: "Збаў нас усіх, Шчодры, і зрабі годнымі валадарства Твайго."

Калі беззаконныя людзі прыбілі да крыжа Цябе, Спасе і Жыцьцё ўсіх, усё стварэньне ў страху задрыжэла, пякельнае валадарства і моц былі разбураныя Боскаю сілаю Тваёю, а прабацька Адам у радасьці ўсклікнуў: "Слава спагадлівасьці Тваёй, Чалавекалюбча."

*Крыжабагародзічны.* Калі Чыстая Дзева ўбачыла, як Ейнага Сына вялі на сьмерць, як чалавека, Яна з плачам усклікнула: "Чаго сьпяшыш пакінуць бязьдзетнаю мяне, якая нарадзіла Цябе, Хрысьце; што Ты ўчыніў, Збавіцелю ўсіх? Слаўлю і ўзьвялічваю бязьмежную дабрыню Тваю і чалавекалюбства, што пераўзыходзіць розум."

**Вершапесьні**

Хрысьце Спасе, які збавіў Пятра ў моры, збаў мяне сілаю крыжа Твайго і зьмілуйся нада мною.

"Хай будзе расьпяты!" — крычалі тыя, што раней карысталіся з дароў Тваіх, і забойцы праведнікаў прасілі сабе разбойніка замест Дабрачынца; але Ты, Хрысьце, маўчаў і ціха пераносіў іхнюю злосьць, жадаючы пацярпець і збавіць нас у чалавекалюбстве Тваім.

Божыя пакутнікі, што не палюбілі зямной уцехі, удастоіліся нябесных дабротаў і сталіся суграмадзянамі анёлаў; малітвамі іх, Госпадзе, зьмілуйся нада мною і збаў мяне.

*Крыжабагародзічны.* Калі Цябе, Спасе, Жыцьцё ўсіх, беззаконныя прыбілі да дрэва крыжовага, тады Чыстая і Беззаганная Маці Твая, стоячы побач, з плачам казала: "Гора Мне, Сыне любы, сьвятло вачэй Маіх! Як гэта Ты, які зямлю на водах павесіў, дазволіў сябе расьпяць сярод разбойнікаў?"

## ПЯТНІЦА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Аддаўшы цела на раны і пацярпеўшы цяжкія мукі і гвалтоўную сьмерць, вы, усяхвальныя мучанікі, мучыцеляў пасаромілі і зьнішчылі ідальскія спакусы, прапаведуючы Хрыста, адзінага Бога і Уладара; і цяпер, супольна з анельскімі хорамі, прабываеце разам з Ім. (*Двойчы*)

Боскія прапаведнікі Слова, што зьявілася на зямлі, і настаўнікі набожнасьці, навучылі нас разуменьня Боскіх праўдаў і адагналі ад Царквы Хрыстовай ілжывыя вучэньні. Цяпер, блаславёныя і асьвячоныя слугі Тройцы, накіроўвайце ўсіх нас да вечнага жыцьця.

*Дагматык.* Цень Закону мінуў... (*Гл. ст. 12*)

**Вершапесьні**

Вялікую славу здабылі вы сабе верай, сьвятыя, бо ня толькі ў цярпеньнях перамаглі ворага, але і пасьля сьмерці злых духаў адганяеце і ацаляеце немачы, лекары душаў і целаў. Маліцеся Госпаду за збаўленьне душаў нашых.

Божыя пакутнікі, што не палюбілі зямной уцехі, удастоіліся нябесных дабротаў і сталіся суграмадзянамі анёлаў. Малітвамі іх, Госпадзе, зьмілуйся нада мною і збаў мяне.

Сьвятых мучанікаў малітвамі і ўслаўленьнем Хрыста ўсякая мана разьвейваецца, і род людзкі верай збаўляецца.

*Багародзічны.* Збаўляй ад бедаў слугаў Тваіх, Багародзіца Дзева, бо пасьля Бога мы ўсе да Цябе прыбягаем, як да непарушнай сьцяны і заступніцы.

# ТОН ТРЭЦІ

## СУБОТУ ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Крыжом Тваім, Хрысьце, сьмерці ўлада зьнішчаная была, і зьніштожаныя хітрасьці д'ябальскія, і род людзкі, збаўляючыся вераю, безупынна Цябе ў песьнях славіць.

Прасьвятлілася ўсё ўваскрасеньнем Тваім, Госпадзе, і рай быў зноў адчынены, і ўсё стварэньне безупынна Цябе ў песьнях славіць.

Слаўлю Айца і Сына сілу, і Духа Сьвятога ўладу, пяю хвалу непадзельнаму Боству, Тройцы адзінасутнай, што пануе вечна.

Пакланяемся пачэснаму Крыжу Твайму, Хрысьце, і ўваскрасеньне Тваё ў песьнях славім: ранамі Тваімі мы ацаліліся.

Славім у песьнях Збавіцеля, які прыняў цела ад Дзевы, бо Ён дзеля нас быў расьпяты і на трэці дзень уваскрос, даруючы нам багацьце свайго зьмілаваньня.

Зышоўшы ў пекла, Хрыстос абвясьціў тым, што былі там, радасную вестку, кажучы: "Будзьце добрай думкі, сёньня Я перамог; Я — ўваскрасеньне, Я выведу вас адсюль, разбурыўшы браму сьмерці."

Стоячы пакорліва ў доме ўсячыстым Тваім, вячэрнюю песьню пяём Табе з глыбіні душы, Хрысьце Божа, бо Ты, Чалавекалюбча, прасьвятліў усіх уваскрасеньнем і выбавіў ад ворагаў людзей Тваіх.

*Дагматык.* Як нам не дзівіцца богачалавечаму мацярынству Твайму, Усячыстая? Ня ведаючы мужа, Ты, бязьвінная, нарадзіла ў целе без Айца Сына — народжанага спрадвеку без маці ад Айца, — які не пацярпеў ніякай зьмены ці разьдзяленьня, але поўнасьцю зьбярог прыкметы дзьвюх прыродаў. Дык малі Яго, Дзева Маці ўладарная, каб Ён збавіў душы тых, што верна вызнаюць Цябе Багародзіцай.

**Вершапесьні**

Мукамі Тваімі, Хрысьце, Ты зацямніў сонца, і зьзяньнем уваскрасеньня Твайго Ты прасьвятліў усё. Прымі нашую вячэрнюю песьню, Чалавекалюбча.

*Верш.* Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу. Апрануўся Госпад у сілу і падперазаўся.

Тваё жыцьцяноснае ўваскрасеньне, Госпадзе, прасьвятліла ўвесь сьвет і паклікала зноў да жыцьця сатлелае стварэньне Тваё. Дзеля гэтага, вызваленыя ад Адамавага праклёну, клічам: "Усемагутны Госпадзе, слава Табе!"

*Верш.* Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца.

Нязьменны Бог, Ты зьмяніўся, пацярпеўшы ў целе. Стварэньне Тваё, ня ў сілах бачыць Цябе на крыжы расьпятага, у страху пахіснулася і, стогнучы, услáвіла Тваю доўгацярплівасьць. Ты ж зышоў у пекла і на трэці дзень уваскрос, даруючы сьвету багацьце Твайго зьмілаваньня.

*Верш.* Дому Твайму належыцца сьвятасьць, Госпадзе, праз усе дні.

Каб выбавіць род наш ад сьмерці, Ты, Хрысьце, сьмерць пацярпеў і, уваскросшы на трэці дзень, увесь сьвет прасьвятліў, і ўзьняў з сабою тых, што пазналі Цябе. Госпадзе, слава Табе!

*Багародзічны.* Воляю Айца і сілаю Духа Сьвятога Ты зачала бяз семя Сына Божага, які нарадзіўся спрадвеку бяз маці ад Айца, але якога Ты дзеля нас без Айца ў целе нарадзіла і, як немаўля, карміла малаком. І цяпер не пераставай маліць Яго выбавіць ад бедаў душы нашыя.

**Адпушчальныя трапары**

***Увага:*** *Спосаб сьпяваньня трапароў у суботу ўвечары гл. ст. 5*

*Уваскросны.* Хай весяліцца неба, хай радуецца зямля, бо Госпад паказаў моц рукі сваёй, сьмерцю зьнішчыўшы сьмерць: Ён, першынец з мёртвых, нас выбавіў з пякельнай бездані і дараваў сьвету багацьце свайго зьмілаваньня.

## НЯДЗЕЛЯ ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Госпадзе Добры, я вельмі зграшыў і Цябе засмуціў, і цяпер вяртаюся зноў да Цябе. Ты ж, Ойча нябесны, у міласэрнасьці ўласьцівай Табе, прымі мяне, як блуднага сына, і зрабі мяне адным з наймітаў Тваіх.

У ленасьці і нядбаласьці я, няшчасны, пераўзышоў усякую меру, а цяпер бачу блізкі канец і думаю пра суд і адлучэньне ад Бога, што чакаюць мяне; але Ты, Збавіцелю, не дапусьці да гэтага, але навярні і збаў мяне.

Выбаў, Добры Госпадзе, маю скрушлівую душу ад геенны, скрыгату зубоў і вечнае мукі, каб мне з вераю ў песьнях славіць Цябе, міласэрнага і чалавекалюбнага Бога.

*Багародзічны.* Усячыстая Маці, Уладарка ўсяго стварэньня, вызвалі розум мой ад грэшных пажаданьняў, якія няволяць мяне, і цёплым заступніцтвам Тваім і матчынаю малітваю зрабі мяне падуладным Сыну і Богу Твайму.

**Вершапесьні**

Вячэрнюю хвалу прыносім Табе, Хрысьце, з кадзілам і песьнямі духоўнымі. Зьмілуйся над намі і збаў нас.

Збаў мяне, Божа мой, які даеш збаўленьне ўсім: бура пажаданьняў пакрывае мяне, і я таплюся пад цяжарам беззаконьняў маіх. Ты ж працягні руку дапамогі і прасьвятлі скрухаю сэрца маё, адзіны міласэрны і Чалавекалюбец.

Вялікая, Госпадзе, сіла крыжа Твайго! Пастаўлены на адным месцы, ён дзейнічае ва ўсім сьвеце, робячы рыбакоў апосталамі і паганаў мучанікамі, якія сёньня моляцца за душы нашыя.

*Багародзічны.* Уладарка і заступніца ўсіх, што моляцца да Цябе: Табою ўмацоўваемся і Табою хвалімся, і ў Табе ўся наша надзея; малі Таго, хто нарадзіўся ад Цябе, за непатрэбных слугаў Тваіх.

## ПАНЯДЗЕЛАК УЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Шматтвары зьмей убачыў ува мне ляніўства да добрага і схільнасьць да злога; ён заманьвае мяне прынадасьцю благіх і грэшных дзеяньняў, праціўных Божым загадам, каб подступам змусіць прыняць зло за дабро.

Пакінуўшы добры шлях, я ахвотна ішоў беззаконнай і грахоўнай сьцежкаю; цяпер, ля варотаў сьмерці, трывожна клічу: "Ісусе мой добры, збаў мяне, накіруй на шлях пакаяньня,

дай мне паправу, і перад тым, як прыйдзе канец, удастой мяне боскага прабачэньня."

Я ўмярцьвіў сябе рознымі грахамі, шматлікімі правінамі і бясчынствамі, і вось ляжу бездапаможны, як труп; але жыве ўва мне адзіная надзея, што Ты, Хрысьце, які даеш мёртвым жыцьцё і дыханьне і ўмярцьвяеш пажадлівасьці, што нас умярцьвляюць, прыйдзеш і выхапіш мяне ад вечнай сьмерці.

*Багародзічны.* Хмара незаходнага сьвятла, Богам абрадаваная Дзева, блаславёная Марыя, дай мне зазьзяць сьвятлом пакаяньня, бо бяздумная цемра грахоўная агарнула мяне; выбаў мяне малітвамі Тваімі ад пякельнага агню і цемры беспрасьветнай, і ўчыні ўдзельнікам незаходнага дня мяне, які прыбягаю пад апеку Тваю, Чыстая.

**Вершапесьні**

Вячэрнюю хвалу прыносім Табе, Хрысьце, з кадзілам і песьнямідухоўнымі. Зьмілуйся над намі і збаў нас.

Збаў мяне, Божа мой, які даеш збаўленьне ўсім: бура пажаданьняў пакрывае мяне, і я таплюся пад цяжарам беззаконьняў маіх. Ты ж працягні руку дапамогі і прасьвятлі скрухаю сэрца маё, як адзіны міласэрны і Чалавекалюбец.

Вялікая мучанікаў Тваіх, Госпадзе, сіла: лежачы ў магілах, яны праганяюць духаў нячыстых і нішчаць варожую ўладу, змагаючыся за дабрадзейнасьці вераю ў сьвятую Тройцу.

*Багародзічны.* Багародзіца Дзева Маці, сьвятая між жанчынаў, малі Уладара і Бога, якога Ты нарадзіла, каб Ён збавіў нас у чалавекалюбстве сваім.

## АЎТОРАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Стварэньне асьвяцілася пачэснаю крывёю, што **пацякла з боку** Твайго, адзіны Даўгацярплівы, рэкі мнагабожжа **высахлі, і Адам** вызваліўся ад асуджэньня расьпяцьцем Тваім.

Бог, Госпад і Творца ўсяго дабравольна абядняецца, мукі за людзей церпіць, і ўзносіцца на крыж з-за праклёну законнага.

Ты быў добравольна расьпяты, Дабрачынца Госпадзе, і з прабітага кап'ём боку Твайго, Жыцьцядаўча, пацяклі дзьве крыніцы несьмяротнасьці; дзеля гэтага ўсе мы верна няспынна славім пакутыТвае.

*Крыжабагародзічны.* Меч прашыў сэрца Тваё, Найчыстая, калі Ты ўбачыла на крыжы Сына Твайго, і Ты ўсклікнула: "Не, пакідай, Сыне, мяне бязьдзетнаю, якую Ты пасьля нараджэньня захаваў Дзеваю."

**Вершапесьні**

Пакланяемся, Хрысьце, Твайму пачэснаму Крыжу, ахоўніку сьвету, збаўленьню нас, грэшных, вялікаму ачышчэньню, бліскучаму пераможцы, сусьветнай славе.

Майсей, стоячы на гары з узьнятымі крыжападобна рукамі, перамог Амалека; Ты ж, Збавіцелю, распасьцёршы рукі на пачэсным крыжы, каб выбавіць мяне з варожай няволі, даў мне яго як сьцяг жыцьця, да якога ўцякаю ад стрэлаў ворагаў маіх. Дзеля гэтага, Слова, пакланяюся пачэснаму крыжу Твайму.

Прарокі, апосталы Хрыстовыя і мучанікі навучылі ўсіх славіць адзінасутную Тройцу і, прасьвятліўшы заблудныя ў мане народы, учынілі сыноў людзкіх суграмадзянамі анёлаў.

*Крыжабагародзічны.* Калі Ты ўбачыла на крыжы Незаходнае Сонца, што зазьзяла з улоньня Твайго і зацьміла промні сонца, Ты, прыбітая бязьмерным болем, усклікнула: "Ты, што добравольна зайшоў, зазьзяй зноў, каб прасьвятліць Мяне і ўвесь сьвет."

## СЕРАДА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Малітвамі пачэсных і боскіх апосталаў Тваіх, добры Чалавекалюбча, адзіны багаты на ласку, дай слугам Тваім супакой, і збаў тых, што славяць Цябе і з вераю пакланяюцца Табе.

Ад стрэлаў нязбожнага ворага вызвальце мяне, сьведкі Божыя, патушыце ягоныя хітрасьці і акрапіце мяне духоўнай расою, малю вас, мудрыя мае дабрачынцы, боскія апосталы.

Калі засядзеце на дванаццацёх пасадах з Судзьдзёю ўсіх, каб судзіць усё стварэньне, не зрабіце мяне падсудным, але вызвальце ад мукаў, дабрачынцы мае, боскія апосталы.

*Багародзічны.* Вялікая сіла цудаў тваіх, Усячыстая: выбаўляеш ад бедаў і ратуеш ад сьмерці, бароніш ад нечаканых напасьцяў, разганяеш сум, і адымаеш правіны людзей.

**Вершапесьні**

Па ўсёй зямлі разышлося вашае навучаньне, сьвятыя апосталы: вы разбурылі ідальскую спакусу багаразумным прапаведаваньнем. Добры высілак ваш, блаславёныя: дзеля гэтага шануем вашуюпамяць.

Галінкі жыцьцядайнай вінаграднай Лазы, вы, слаўныя апосталы, прынесьлі сябе Богу як плод дабрадзейнасьцяў; дзеля гэтага, маючы ласку ў Госпада, прасеце Яго дараваць сьвету супакой і душам нашым веліч зьмілаваньня.

Мучанікі Твае, Госпадзе, вераю ўмацаваныя, надзеяю падтрымваныя і зьяднаныя любоўю крыжа Твайго, мучыцеля ворага зьнішчожылі і, атрымаўшы вянцы перамогі, з бесьцялеснымі анёламі моляцца за душы нашыя.

*Багародзічны.* З агню няўхільнага за вялікія грахі мае, выхапі мяне, Дзева, матчынымі тваімі малітвамі і накіруй на збавенны шлях.

## ЧАЦЬВЕР УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Непадуладны цярпеньням Боскай існасьцю, Ты, Госпадзе, цярпеў мукі згодна з Тваёй людзкой прыродаю. Прыбіты да крыжа і прабіты кап'ём у бок, Ты выліў для мяне два струмені невыказных тайнаў.

Каранаваны на зьдзек вянком з церняў, Ты, Уладару і Збаўца ўсіх, разарваў цярністага граху кару і, прыняўшы ў рукі трысьціну, запісаў у нябеснай кнізе ўсіх нас, што ўверылі ў Цябе.

Не сунялася зайздрасьць тых, што расьпялі Цябе, калі Ты, нязлосны Хрысьце, памёр, бо і тады абазвалі Цябе ашуканцам і, засьлепленыя злосьцю, прасілі Пілата сьцерагчы магілу Тваю.

*Крыжабагародзічны:* "Сьвет атрымаў міласьць укрыжааваньнем Тваім, Слова, стварэньне прасьвятлілася, народы знайшлі збаўленьне, Уладару, — Найчыстая ўсклікнула. — Я ж сёньня мучуся, гледзячы на Твае дабравольныя цярпеньні."

**Вершапесьні**

Пакланяемся, Хрысьце, Твайму пачэснаму Крыжу, ахоўніку сьвету, збаўленьню нас, грэшных, вялікаму ачышчэньню, бліскучаму пераможцы, сусьветнай славе.

Майсей, стоячы на гары з узьнятымі крыжападобна рукамі, перамог Амалека; Ты ж, Збавіцелю, распасьцёршы рукі на пачэсным крыжы, каб выбавіць мяне з варожай няволі, даў мне яго як сьцяг жыцьця, да якога ўцякаю ад стрэлаў ворагаў маіх. Дзеля гэтага, Слова, пакланяюся пачэснаму крыжу Твайму.

Вялікая, Госпадзе, сіла крыжа Твайго! Пастаўлены на адным месцы, ён дзейнічае ва ўсім сьвеце, робячы рыбакоў апосталамі і паганаў мучанікамі, якія сёньня моляцца за душы нашыя.

*Крыжабагародзічны.* Калі Беззаганная ўбачыла Цябе, Хрысьце добры мой, узьнесеным на крыжы, Яна па-матчынаму заплакала і ўсклікнула: "Сыне мой любы, як гэта грамада беззаконьнікаў прыбіла Цябе да крыжа?"

## ПЯТНІЦА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Адважныя мучанікі шмат пацярпелі, мужна пераносячы раны, вязьніцы і розныя мукі; і, як узнагароду, атрымалі бязбольную і блаславёную спадчыну.

Вы, Гасподнія сьвятары, зьнішчылі ілжывыя варожыя вучэньні, пашыраючы набожную і боскую навуку, і былі для ўсіх верных духоўнымі настаўнікамі. Дзеля гэтага шануем вас.

Баганосныя айцы, вы ўпадобніліся да духоўных і бесьцялесных істотаў: будучы ў целе, вы былі пераймальнікамі санёльскага жыцьця. Цяпер вы жывеце ў іхніх сялібах.

*Дагматык.* Як нам не дзівіцца... (*Гл. ст. 19*)

**Вершапесьні**

Мучанікі Твае, Госпадзе, вераю ўмацаваныя, надзеяю падтрымваныя і зьяднаныя любоўю крыжа Твайго, мучыцеля ворага зьніштожылі і, атрымаўшы вянцы перамогі, з бесьцялеснымі анёламі моляцца за душы нашыя.

Вялікая, Госпадзе, сіла крыжа Твайго! Пастаўлены на адным месцы, ён дзейнічае ва ўсім сьвеце, робячы рыбакоў апосталамі і паганаў мучанікамі, якія сёньня моляцца за душы нашыя.

Прарокі, апосталы Хрыстовыя і мучанікі навучылі ўсіх славіць адзінасутную Тройцу і, прасьвятліўшы заблудныя ў мане народы, учынілі сыноў людзкіх суграмадзянамі анёлаў.

*Багародзічны.* Найсьвяцейшая між жанчынаў Багародзіца, Дзева Маці! Малі Народжанага ад Цябе Ўладара і Бога, каб Ён як Чалавекалюбец збавіў нас.

# ТОН ЧАЦЬВЕРТЫ

## СУБОТА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Жыцьцядайнаму крыжу Твайму безупынна пакланяемся, Хрысьце Божа, і славім трохдзённае ўваскрасеньне Тваё, якім Ты, Усясільны, абнавіў людзкую прыроду і як добры і Чалавекалюбец адкрыў зноў да неба ўваход.

Прыбіты да крыжовага дрэва, Ты, Збавіцелю, забарону дрэва непаслушэнства адмяніў і, зышоўшы да пекла, як усемагутны Бог, путы сьмерці разарваў. Дзеля гэтага пакланяемся Твайму трохдзённаму ўваскрасеньню і радасна клічам: "Усемагутны Госпадзе, слава Табе!"

Ты, Госпадзе, разьбіў вароты пекла і сьмерцю Тваёю зьнішчыў сьмерці ўладу, і род людзкі ад тленнасьці выбавіў, даруючы сьвету жыцьцё і нятленнасьць, і багацьце зьмілаваньня Твайго.

Прыйдзіце, людзі, усхвалім у песьнях трохдзённае ўваскрасеньне Збавіцеля, якім мы вызваліліся ад непарушных пякельных путаў і атрымалі жыцьцё і нятленнасьць. Дык усклікнем усе: "Адзіны Чалавекалюбча, што быў расьпяты і пахаваны, і ўваскрос, збаў нас уваскрасеньнем Тваім."

Анёлы і людзі, Збавіцелю, славяць Тваё ўваскрасеньне на трэці дзень, якім прасьвятліліся ўсе канцы зямлі, і мы вызваліліся ад варожай няволі. Дык усклікнем усе: "Усемагутны Жыцьцядаўча, Збавіцелю наш, збаў нас уваскрасеньнем Тваім, адзіны Чалавекалюбча!"

Ты, Хрысьце Божа, разбурыў медзяныя вароты і жалезныя замкі разьбіў, і род людзкі ўваскрасіў. Дзеля гэтага ў адзін голас клічам: "Госпадзе, што ўваскрос з мёртвых, слава Табе!"

Нараджэньне Тваё ад Айца, Госпадзе, пазачаснае і вечнае; Тваё ўцелаўленьне ад Дзевы няўцямнае для людзей і невыказнае; зыход Твой у пекла страшны быў для д'ябла і паплечнікаў яго, бо Ты, уваскросшы на трэці дзень, перамог сьмерць і дараваў сьвету багацьце Твайго зьмілаваньня.

*Дагматык.* Прарок Давід, які праз Цабе стаўся богаайцом, у песьні Таму, хто вялікія рэчы для Цябе ўчыніў, так пра Цябе прадказаў: "Каралева стала па правай руцэ Тваёй." Ён явіў Цябе, як хадайніцу і Маці Жыцьця, бо ад Цябе захацеў прыняць цела і

стацца чалавекам Хрыстос Бог, каб аднавіць сатлелы прагнасьцю вобраз свой і знайсьці заблудную ў горных безданях авечку, каб, узяўшы яе на плечы, прынесьці да Айца і даць ёй месца разам з нябеснымі сіламі, і збавіць, Багародзіца, сьвет у велічы і багацьці міласэрнасьці сваёй.

**Вершапесьні**

Ты, Госпадзе, узышоўшы на крыж, прадзедавы праклён адмяніў і, зышоўшы да пекла, вечных вязьняў вызваліў, і дараваў несьмяротнасьць людзкому роду. Дзеля гэтага ў песьнях славім жыцьцядайнае і збаўленнае ўваскрасеньне Тваё.

*Верш.* Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу. Апрануўся Госпад у сілу і падперазаўся.

Калі Ты, адзіны Сільны, быў павешаны на крыжы, Ты ўсё стварэньне ўскалыхнуў; пакладзены ў магілу, Ты ўсіх уваскрасіў, даруючы нятленнасьць людзкому роду. Дзеля гэтага ў песьнях славім жыцьцядайнае ўваскрасеньне Тваё.

*Верш.* Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца.

Людзі беззаконныя і няўдзячныя, забыўшыся на дабрадзействы, якія Ты, Хрысьце, ім учыніў, аддалі Цябе Пілату і асудзілі на ўкрыжаваньне. Але Ты, пацярпеўшы дабравольна пахаваньне, на трэці дзень уваскрос у сіле, як Бог, даруючы нам бясконцае жыцьцё і багацьце Твайго зьмілаваньня.

*Верш.* Дому Твайму належыцца сьвятасьць, Госпадзе, праз усе дні.

Жанчыны, што прыйшлі да магілы Тваёй са сьлязамі, шукалі Цябе і, не знайшоўшы, з плачам казалі: "Гора нам, Збавіцелю наш і Ўладару ўсіх! Як гэта Ты быў украдзены? Якое месца скрывае жыцьцядайнае цела Тваё?" Анёл адазваўся да іх, кажучы: "Пакіньце плач, але ідзіце і абвяшчайце, што Госпад уваскрос, даруючы радасьць нам, як адзіны Добрасардэчны."

*Багародзічны.* Глянь прыхільна на маленьні слуг Тваіх, Багародзіца, і адхілі ад нас цяжкія напасьці, выбаўляючы нас ад усякага смутку, бо ў Табе адзінай маем пэўную і цьвёрдую абарону і на Тваё заступніцтва спадзяемся. Дык ня дай нам пасаромецца, Уладарка, калі мы зьвяртаемся да Цябе, але адгукніся хутка на просьбы тых, што ў веры клічуць: "Радуйся, Уладарка, дапамога, радасьць, ахова і збаўленьне душ нашых!"

**Адпушчальныя трапары**

*Увага: Спосаб сьпяваньня трапароў у суботу ўвечары гл. ст. 5.*

*Уваскросны.* Сьветлую весьць аб уваскрасеньні і аб адмене прадзедаўскага асуджэньня ад анёла пачуўшы, Гасподнія вучаніцы апосталам з радасьцю сказалі: "Сьмерць пераможаная, Госпад Бог уваскрос, даруючы сьвету багацьце свайго зьмілаваньня."

## НЯДЗЕЛЯ ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Зграшыў я перад Табою, Госпадзе, ня толькі дзеля слабасьці маёй, але нязвыкла і недаравальна. Але Ты, Збавіцелю, што ў надпрыродны і невыказны спосаб стаўся чалавекам, дзеля бязьмежнага чалавекалюбства Твайго, зьмілуйся нада мною, які прыбягаю да Цябе.

Ты, Хрысьце, устанавіў пакаяньне для грэшных, а не для праведных; маючы прыклад разбойніка і блуднага сына, Манасіі і блудніцы, прасьледавальніка, мытніка і здрадніка, я ня трачу надзеі, бо ведаю Тваё, Збавіцелю, чалавекалюбства і дабрыню, і са скрухаю прыбягаю да Цябе, поўны спадзяваньня, што выслухаеш мяне.

Дай мне скруху сардэчную, паварот ад злога і дасканалую паправу, бо я, адлучаны ад Цябе, Божа і Уладару ўсіх, страціўшы ўсякую надзею, таплюся ў цялесных пажаданьнях. Але Ты, Ісусе ўсемагутны, Збавіцелю душаў нашых, збаў мяне, заблуднага, у вялікай міласэрнасьці Тваёй.

*Багародзічны.* Вышэйшая за анёлаў, Беззаганная Дзева, разам з імі малі Уладара анёлаў і ўсяго стварэньня дараваць нам адпушчэньне правінаў, вызваліць нас ад грэшных пажаданьняў і ўчыніць дастойнымі славіць Яго і быць спадкаемцамі вечнага жыцьця.

**Вершапесьні**

Я жадаў сьлязьмі змыць сьляды правінаў маіх, Госпадзе, каб у далейшым жыцьці дагадзіць Табе пакаяньнем, але вораг спакушае мяне і змагаецца з душой маёй. Госпадзе, перш чым прыйдзе канец, ня дай мне згінуць, але збаў мяне.

Хто, Госпадзе, патрапіўшы ў буру, не выратуецца, прыбегшы да Твайго прыстанішча? Або хто, занядужаўшы, не выздаравее, пакаштаваўшы Твайго лякарства? Госпадзе, Творца ўсяго і Лекару нядужых, перш чым мне зусім згінуць, збаў мяне.

Хрысьце Божа, праслаўлены памяцьцю сьвятых Тваіх, малітвамі іх пашлі нам веліч зьмілаваньня Твайго.

*Багародзічны.* Радуйся, сьветлая хмара! Радуйся, ясны сьветач! Радуйся, посудзе манны! Радуйся, палка Аарона! Радуйся, кусьце незгаральны! Радуйся, хораме; радуйся, пасадзе! Радуйся, гара сьвятая! Радуйся, прыстанішча! Радуйся, Боскае застольле! Радуйся, тайная брама! Радуйся, усіх радасьць!

## ПАНЯДЗЕЛАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Бяры, душа мая, прыклад з хананейкі, дакраніся да Хрыста і кліч раз-пораз: "Зьмілуйся нада мною, Уладару, бо маю дзіця — распуснае цела. Дык прашу Цябе, Дабрачынца ўсеміласэрны, адымі ад яго жар пажадлівасьцяў, утаймуй бясчынныя хістаньні і ўмярцьві іх збавенным страхам Тваім, малітвамі Найчыстае — якая зачала і нарадзіла Цябе, Хрысьце, — і ўсіх сьвятых!"

Некалі Ты, Хрысьце, паслаў да Ніневіцянаў Ёну прапаведаваць, што, калі пакаюцца, Ты явіш ім міласьць, і ў гневе Тваім не загубіш іх. У міласэрнасьці Тваёй, Уладару, пашлі і мне, нягоднаму, дапамогу Тваю, каб мне адвярнуцца ад бясчынстваў і выйсьці на шлях пакаяньня, плачучы і просячы вызваленьня ад шматлікіх правінаў маіх.

Ты прыйшоў на сьвет, каб збавіць грэшнікаў і паклікаць іх да пакаяньня. і Я ўгнявіў Цябе больш за ўсіх, але Ты, Шчодры Збаўцелю мой, зьмілуйся і збаў мяне, накіруй на шлях пакаяньня, дай жаль за грахі і зрабі сэрца маё пакорным, простым, лагодным і вольным ад хітрасьцяў у дабрасардэчнасьці Тваёй.

*Багародзічны.* Дай мне, Дзева, сьлёзы і ўздыханьні з глыбіні душы, і скруху сардэчную, і вызнаньне зробленых мною ў жыцьці правінаў, каб мне з Тваёй дапамогай, Усячыстая, у пакаяньні прайсьці шлях жыцьця майго і атрымаць збаўленьне.

**Вершапесьні**

Я жадаў сьлязьмі змыць сьляды правінаў маіх, Госпадзе, каб у далейшым жыцьці дагадзіць Табе пакаяньнем, але вораг спакушае мяне і змагаецца з душой маёй. Госпадзе, перш чым прыйдзе канец, ня дай мне згінуць, але збаў мяне.

Хто, Госпадзе, патрапіўшы ў буру, не выратуецца, прыбегшы да Твайго прыстанішча? Або хто, занядужаўшы, не выздаравее, пакаштаваўшы Твайго лякарства? Госпадзе, Творца ўсяго і Лекару нядужых, перш чым мне зусім згінуць, збаў мяне.

Ты, што прымаеш цярпеньні мучанікаў сьвятых, і ад нас прымі, Чалавекалюбча, песьню хвалы, і малітвамі іх даруй нам веліч зьмілаваньня Твайго.

*Багародзічны.* Выбаў нас ад бедаў нашых, Маці Хрыста Бога, што нарадзіла Творцу ўсіх, каб нам усім клікаць: "Радуйся, адзіная заступніца душаў нашых!"

## АЎТОРАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Калі Ты быў ўзьняты на крыжы і прабіты кап'ём, акрываўленымі пальцамі Ты, добры Уладару, падпісаў нам вызваленьне і, адмяніўшы прысуд прабацькі Адама, вызваліў род людзкі. Дзеля гэтага, Шчодры, славім Тваю бязьмежную дабрыню.

Славім Твае, Уладару Ісусе, цярпеньні — крыж, кап'ё і трысьціну, губку і цьвікі, біцьцё, пурпуровую вопратку і цярновы вянок, апляваньні і насьмешкі, якія Ты дабравольна перанёс. Узьвялічваем Тваё, Жыцьцядаўча, нязлоснае доўгацярпеньне і славім Цябе, Чалавекалюбча.

Пакланяюся пачэснаму Крыжу Твайму, Усядобры, з любоўю цалую яго, і слаўлю Тваю спагадлівасьць, што пераўзыходзіць розум, і веліч дабрыні, дзякуючы якой Ты збавіў людзкую прыроду, што была трыманая ў цемры правінаў. Слава, Хрысьце, расьпяцьцю Твайму.

*Крыжабагародзічны.* Калі Ўсячыстая ўбачыла расьпятага на крыжы і прабітага ў бок Хрыста Чалавекалюбца, Яна з плачам усклікнула: "Што гэта, Сыне мой? Што зрабілі Табе няўдзячныя людзі ўзамен за дабро, якое Ты ім чыніў; і як гэта Ты, любы мой,

пакідаеш Мяне бязьдзетнаю? Дзіўлюся, Добрасардэчны, Твайму дабравольнаму расьпяцьцю."

**Вершапесьні**

Ты, Хрысьце, даў нам Крыж Твой, як неператожную зброю, і мы перамагаем ім падкопы ворага.

Маючы заўжды на дапамогу Крыж Твой, Хрысьце, мы лёгка нішчым варожыя сеці.

Маючы ласку ў Збавіцеля, маліце Яго, сьвятыя, няспынна за нас, грэшных, каб Ён даў нам адпушчэньне грахоў і душам нашым веліч зьмілаваньня.

*Крыжабагародзічны.* "Ня плач па мне, Маці, бачачы на крыжы павешанага Сына Твайго, які на водах зямлю павесіў і ўсё, што існуе, стварыў. Я ўстану і праслаўлюся, і пякельнае ўладарства скрышу сілаю Маёю, зьнішчу ягоную ўладу, і вязьняў ягоных вызвалю ў міласэрнасьці Маёй і як Чалавекалюбец да Айца прывяду."

## СЕРАДА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Узброеныгя ў найвышэйшую мудрасьцюь і апранутыя ў духоўны панцыр, вы, слаўныя, выйшлі на змаганьне супраць хітрага ворага, зьнішчылі ўсю сілу і, як здабычу, выхапілі з рук ягоных душы людзей. Дзеля гэтага славім вас на ўсе вякі.

Распасьцёршы накрыж сець веры, дванаццаць боскіх апосталаў Тваіх, Хрысьце, злавілі ўсе народы і салонае мора пажадлівасьцяў высушылі. Дзеля гэтага малю Цябе: "Малітвамі іх з бездані правінаў выратуй мяне."

Богам выбраную і пачэсную дванаццатку апосталаў — Пятра і Паўла, Якуба, Луку, Яна і Мацьвея, Тамаша, Марка, Сымона і Піліпа, а таксама слаўных Андрэя і Масея, — а з імі іншых семдзесят вучняў у боскіх песьнях сёньня ўсхвалім.

*Багародзічны.* Ты, Усячыстая, што ва ўлоньні сваім зьмясьціла незьмяш-альнага Бога, які ў чалавекалюбстве сваім стаўся чалавекам, ад Цябе прыняў нашую прыроду і абагавіў яе, не пагарадзі мною, поўным суму і жалю, але хутка зьмілуйся і ад варожых напасьцяў і хітрасьцяў вызваль мяне.

**Вершапесьні**

Ты, Хрысьце, прасьвятліў апостальскі хор Духам Сьвятым. Малітвамі іх ачысьці нашую брыдоту грахоўную і зьмілуйся над намі.

Някніжных вучняў Дух Твой Сьвяты, Хрысьце Божа, учыніў настаўнікамі і, як усясільны, іхнім сугучным шматгалосным прапаведаваньнем ілжывыя вучэньні адмяніў.

Адухоўленыя ахвяры, цэлапаленьні духоўныя, мучанікі Господнія, дасканалыя Божыя ахвярапрынашэньні, Богу вядомыя авечкі, што Бога знаюць і загарадзь якіх недаступная ваўкам: маліцеся, каб нам разам з вамі на ціхіх водах знайсьці супакаеньне.

*Багародзічны.* Выбаў нас ад бедаў, Маці Хрыста Бога, што нарадзіла Творцу ўсіх, каб нам клікаць: "Радуйся, адзіная заступніца душаў нашых!"

## ЧАЦЬВЕР УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Усё стварэньне, убачыўшы Цябе, доўгацярплівы Збавіцелю, расьпятым на крыжы і зьняважаным, зьмянілася і задрыжэла: зямля затрэслася і пахіснулася, заслона царкоўная разарвалася, каменьне патрэскалася і сонца памеркла, пазнаўшы ў Табе Творцу свайго.

Як гэта беззаконнае зборышча асьмелілася асудзіць Цябе, несьмяротнага Судзьдзю, які некалі даў у пустыні закон багавідцу Майсею? Як гэта яны, бачачы на крыжы памёрлым Жыцьцё ўсіх, не збаяліся, не прыйшлі да розуму і не зразумелі, што Ты — адзіны Госпад, Уладар стварэньня?

Адмяняецца спрадвечны прысуд праайца Адама прабіцьцём боку Твайго, Шматміласэрны, і адкінутая людзкая прырода, асьвячоная праліцьцём крыві Тваёй, кліча: "Слава дабрасардэчнасьці Тваёй, слава Боскаму расьпяцьцю Твайму, Ісусе ўсемагутны, Збавіцелю душаў нашых!"

*Крыжабагародзічны.* Калі Сонца і месяц убачылі Цябе, Сонца праведнасьці, Чалавекалюбча мой Хрысьце, павешаным на

крыжы, яны схавалі промні свае, зямля ўскалыхнулася ў страху перад Тваёй веліччу. Маці ж Твая, поўная болю, усклікнула: "Ісусе мой добры, слава дабрасардэчнасьці Тваёй!"

**Вершапесьні**

Ты, Хрысьце, даў нам Крыж Твой, як непераможную зброю, і мы перамагаем ім падкопы ворага.

Маючы заўжды на дапамогу Крыж Твой, Хрысьце, мы лёгка нішчым варожыя сеці.

Хрысьце Божа, праслаўлены памяцьцю сьвятых Тваіх, малітвамі іх пашлі нам веліч зьмілаваньня Твайго.

*Крыжабагародзічны.* "Ня плач па мне, Маці, бачачы на крыжы павешанага Сына Твайго, які на водах зямлю павесіў і ўсё, што існуе, стварыў. Я ўстану і праслаўлюся, і пякельнае ўладарства скрышу сілаю Маёю, зьнішчу ягоную ўладу, і вязьняў ягоных вызвалю ў міласэрнасьці Маёй і як Чалавекалюбец да Айца прывяду."

## ПЯТНІЦА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Пераймаючы цярпеньні Хрыста-Чалавекалюбца, вы, пакутныя мучанікі, аддалі целы вашыя на раны і цяжкія мукі і пацярпелі шмат бедаў у прадбачаньні непраміальнай боскай райскай радасьці, незьнішчальнай спажывы і вечнай славы. Атрымаўшы іх, маліцеся за тых, што шануюць вашую памяць.(*Двойчы*).

Пастыры асьвячоныя! Як пераймальнікі Найвышэйшага Пастыра, Хрыста Ўладара ўсіх, вы ахвотна аддалі свае душы за авечак і пацярпелі вялікія беды ў змаганьні з ворагамі. Збаўляйце, пахвалы годныя і Богам абраныя, статак ваш ад шкоды.

*Дагматык.* Прарок Давід.... (*Гл. ст. 27*)

**Вершапесьні**

Хрысьце Божа, праслаўлены памяцьцю сьвятых Тваіх, малітвамі іх пашлі нам веліч зьмілаваньня Твайго.

Ты, што прыняў цярпеньні мучанікаў Тваіх, прымі, Чалавекалюбча, і наша хваленьне, і малітвамі іх даруй нам багацьце зьмілаваньня Твайго.

Адухоўленыя ахвяры, цэлапаленьні духоўныя, мучанікі Гасподнія, дасканалыя Божыя ахвярапрынашэньні, Богу вядомыя авечкі, што Бога знаюць і загарадзь якіх недаступная ваўкам: маліцеся, каб нам разам з вамі на ціхіх водах знайсьці супакаеньне.

*Багародзічны.* Сьветач нязгасны, пасад праведны, Усячыстая Уладарка, маліся за збаўленьне душаў нашых.

# ТОН ПЯТЫ

## СУБОТА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Пачэсным крыжом Тваім, Хрысьце, Ты д'ябла пасароміў, і ўваскрасеньнем Тваім джала сьмерці прытупіў, і выбавіў нас ад варотаў сьмерці. Слава Табе, Адзінародны!

Той, хто дае ўваскрасеньне роду людзкому, быў ведзены на ахвяру, быццам ягнё. Уладары пякельныя сумеліся, і адчыніліся вароты плачу, бо ўвайшоў Уладар славы Хрыстос, сказаўшы вязьням: "Выходзьце!" і тым, што ў цемры: "Хадзеце да сьвятла!"

Вялікі цуд! Творца нябачнага бачна пацярпеў дзеля чалавекалюбства і ўваскрос як несьмяротны. Дык прыйдзеце, усе народы, і пакланецеся Яму, бо праз Ягоную міласэрнасьць мы выбавіліся ад маны і навучыліся ўзьвялічваць у трох асобах адзінага Бога.

Вячэрняе пакланеньне прыносім Табе, несьмяротнаму Сьвятлу, што ў апошнія дні ў целе, быццам у люстры, зазьзяў на ўвесь сьвет і, зыйшоўшы да пекла, разьвеяў цемру, што панавала там, і паказаў усім людзям сьвятло ўваскрасеньня. Сьветладаўча Госпадзе, слава Табе!

Уладара збаўленьня нашага Хрыста ў песьнях уславім, бо Ён уваскрос з мёртвых і сьвет ад маны вызваліў. Радуюцца хоры анёлаў, уцякае дэманская спакуса, Адам ад падзеньня свайго ўстаў, і д'ябал застаўся пераможаным.

Навучалі вартаўнікоў нягоднікі: "Схавайце Хрыстовае ўваскрасеньне, вазьміце заплату і скажыце: Калі мы спалі, мёртвага з магілы ўкралі ад нас." Хто калі бачыў, хто чуў, каб укралі памёрлага, памазанага і голага, пакінуўшы ў магіле пахавальныя палотны? Не ашуквайце сябе, юдэі, а лепш дасьледуйце сказаньні прарокаў і зразумейце, што Ён сапраўды Збаўца сьвету і ўсемагутны.

Збавіцелю наш Госпадзе, што пекла паланіў і зьнішчыў сьмерць, і прасьвятліў усіх крыжом Тваім, зьмілуйся над намі!

*Дагматык.* У Чырвоным моры вобраз Дзевы Маці быў нам некалі дадзены. Там Майсей ваду разьдзяліў, — тут Габрыель цуду паслужыў; тады Ізраіль перайшоў глыбіні марскія, быццам сушу, — цяпер Дзева нарадзіла бяз семя Хрыста; мора, пасьля пераходу

Ізраіля стала зноў непраходным — Бязьвінная, нарадзіўшы Эмануэля, засталася Дзеваю. Божа спрадвечны, што зьявіўся дзеля нас у целе, як чалавек, зьмілуйся над намі!

**Вершапесьні**

Цябе, Збавіцелю Хрысьце, што аб'явіўся ў целе, не адлучыўшыся ад неба, песьнямі звонкімі ўзьвялічваем, бо Ты крыж і сьмерць пацярпеў за род наш, і як чалавекалюбны Госпад разбурыў браму пякельную і на трэці дзень уваскрос, даючы збаўленьне душам нашым.

*Верш.* Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу. Апрануўся Госпад у сілу і падперазаўся.

З прабітага боку Твайго, Хрысьце, Ты выліў струмені жыцьця і збаўленьня ўсім і, пацярпеўшы цялесную сьмерць, дараваў несьмяротнасьць нам; пасяліўшыся ў магіле, Ты як Бог вызваліў нас і ўваскрасіў з сабою. Дзеля гэтага славім Цябе і ўсклікаем: "Чалавекалюбча Госпадзе, слава Табе!"

*Верш.* Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца.

Дзіўнае Тваё, Госпадзе, укрыжаваньне і зыход да пекла: паланіўшы яго і вызваліўшы вязьняў, што былі там, Ты як Бог рай адчыніў, каб узяць іх туды з сабою. Дзеля гэтага і нам, якія славім трохдзённае ўваскрасеньне Тваё, адзіны Міласэрны, даруй адпушчэньне грахоў і дазволь стацца жыхарамі раю.

*Верш.* Дому Твайму належыцца сьвятасьць, Госпадзе, праз усе дні.

Чалавекалюбны Госпадзе, які дзеля нас пацярпеў і на трэці дзень уваскрос, аздараві нашыя цялесныя слабасьці, вызваль ад цяжкіх правінаў і збаў нас!

*Багародзічны.* Ты — сьвятыня і брама, хорам і пасад Уладара, Дзева ўсячыстая: праз Цябе зьявіўся Збаўца мой Хрыстос Бог тым, што сядзелі ў цемры. Ён, Сонца праведнасьці, захацеў прасьвятліць тых, каго Ён сваёю рукою стварыў на вобраз свой. Дзеля гэтага, Усяхвальная, маючы матчыную ласку ў Яго, маліся нястомна за збаўленьне душаў нашых.

**Адпушчальныя трапары**

***Увага:** Спосаб сьпяваньня трапароў у суботу ўвечары гл. ст. 5.*

*Уваскросны.* Слова, спрадвечнае з Айцом і Духам, ад Дзевы народжанае для збаўленьня нашага, усхвалім, верныя, і паклонімся Яму. Бо Ён захацеў дабравольна целам узысьці на крыж і сьмерць пацярпець, і ўваскрасіць памёрлых слаўным уваскрасеньнем сваім.

## НЯДЗЕЛЯ ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Плачу і сумую, калі думаюпра страшны дзень расплаты, і не знаходжу ва ўчынках маіх адказу за правіны мае. Таму малюся: "Перш, чым прыйдзе неспадзявана канец і сьмерць скосіць мяне, перш, чым мне стаць на апошнім судзе і атрымаць прысуд на нязгасны агонь і беспрасьветную цемру, дзе чэрві і скрыгат зубоў, і грэшнікі гібеюць — дай мне, Хрысьце мой, вызваленьне ад грахоў у вялікай міласэрнасьці Тваёй."

Я, няшчасны, занядбаў законы і пісаньні, і адкінуў прыказаньні Твае, Божа і Творча мой: як цяпер уцяку ад кары, што чакае мяне? Але Ты, Збавіцелю, перш чым прыйдзе канец, дай мне прабачэньне, струмені сьлёз і дух шчырага жалю, адгані варожыя сілы, што намагаюцца зьвесьці мяне ў пякельную бездань. Малюся Табе, добры Божа, не адымі ад мяне Тваёй магутанай рукі.

Гора мне! Розум мой пацямнеў, і я, няшчасны, аддаліўся ад Цябе, і ўсе сілы трачу ў грахох, аддаўшы сябе пад уладу цялесным пажаданьням, што жывуць ува мне. Цяпер чакаю канца майго жыцьця і кары, што чакае мяне. Госпадзе добры, які даеш сьвету веліч зьмілаваньня Твайго, дай мне сьлёзы жалю і адпушчэньне правінаў, малюся шчыра Табе.

*Багародзічны.* Ты, Усячыстая, сапраўды пасад хэрувімскі, вышэйшя за анёлаў, бо ў Табе пасялілася Божае Слова, каб абнавіць наш вобраз. У міласэрнасьці сваёй Ён нарадзіўся, узяўшы цела ад Цябе, і цярпеў мукі дзеля нас, і як Бог дараваў нам уваскрасеньне. Дзеля гэтага дзякуем Тварцу, які адмяніў прысуд нашай прыроды, і молімся, каб атрымаць заступніцтвам Тваім прабачэньне правінаў і веліч зьмілаваньня.

**Вершапесьні**

Госпадзе, не перастаю грашыць і не хачу зразумець Тваёй спагадлівасьці да мяне. Разьвей маё неразуменьне, Адзіны Добры, і зьмілуйся нада мною.

Госпадзе, я ў страху перад Табою, але не пакідаю рабіць зло. Хто на судзе не баіцца судзьдзі? Або хто, шукаючы ацаленьня, гнявіць лекара, як я Цябе? Даўгацярплівы Госпадзе, будзь спагадлівы да маёй слабасьці і зьмілуйся нада мною.

Ня дбаючы пра дачаснае і наважыўшыся мужна на мукі, вы, слаўныя мучанікі, ня страцілі надзеі блаславёных і атрымалі ў спадчыну нябеснае валадарства. Маючы ласку ў чалавекалюбнага Бога, прасіце Яго даць сьвету супакой і душам нашым веліч зьмілаваньня.

*Багародзічны.* Страшная і вялікая тайніца! Незьмяшчальны ва ўлоньні зьмяшчаецца, і Маці пасьля родаў застаецца Дзеваю, нарадзіўшы Бога, які ад Яе прыняў цела. Разам з анёламі мы хвалім Яго і славім у песьнях, усклікаючы: "Сьвяты Ты, Хрысьце Божа, які дзеля нас стаўся чалавекам. Слава Табе!"

## ПАНЯДЗЕЛАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Гора мне, бо я ўгнявіў Цябе, міласэрнага Бога майго і Госпада! Колькі разоў, Хрысьце, я абяцаў пакаяцца, і аказаўся ашуканцам. Перш я забрудзіў вопратку хрышчэньня, зламаў запавет з Табою і не датрымаў абяцаньняў, якія я даў перад людзьмі і анёламі. Але Ты, Збавіцелю, ня дай мне згінуць да канца.

Які адказ дасі, няшчасная душа, у судны дзень? Хто выбавіць цябе ад вечнага агню і мукаў ? Ніхто, калі ты сама, пакінуўшы твае благія навыкі, ня ўміласьцівіш Дабрачынца, і не пачнеш жыць дабрадзейна, абмываючы сьлязамі правіны, зробленыя табою словам, учынкам і думкаю, і молячы Хрыста даць табе дасканалае прабачэньне.

Ня дай, Уладару, быць мне ў палоне грэшных навыкаў: хай бес не панавуе нада мною, і не падпарадкоўвае мяне волі сваёй. У чалавекалюбстве Тваім выхапі мяне магутнай рукою Тваёю з-пад ягонай улады, пасяліся ўва мне, і зрабі мяне поўнасьцю Тваім, каб я жыў згодна з воляй Тваёй, Слова, знайшоў супакой у Табе, і атрымаў збаўленнае прабачэньне і веліч зьмілаваньня.

*Багародзічны.* Ад маладосьці маёй я аддаў сябе граху; мой розум пацямнеў, і я жыў у цемры; але сёньня, зьняверааны, плачу і сумую, што дрэннымі звычкамі і бяздумнасьцю я загубіў душу маю. Не пагардзі мною, які гіну, Уладарка, але пакажы дабрыню

Тваю і Тваім заступніцтвам выбаў мяне ад усякіх напасьцяў і злых пажаданьняў, каб мне хоць на старасьць пакаяцца перад Богам.

**Вершапесьні**

Госпадзе, не перастаю грашыць і не хачу зразумець Тваёй спагадлівасьці да мяне. Разьвей маё неразуменьне, Адзіны Добры, і зьмілуйся нада мною.

Госпадзе, я ў страху перад Табою, але не пакідаю рабіць зло. Хто на судзе не баіцца судзьдзі? Або хто, шукаючы ацаленьня, гнявіць лекара, як я Цябе? Даўгацярплівы Госпадзе, будзь спагадлівы да маёй слабасьці і зьмілуйся нада мною.

Засланіўшыся шчытом веры і ўмацаваўшы сябе знакам крыжа, сьвятыя Твае, Госпадзе, адважна выйшлі на змаганьне і перамаглі д'ябальскую гордасьць і ману; малітвамі іх, Божа ўсемагутны, даруй сьвету супакой і душам нашым багацьцьце Твайго зьмілаваньня.

*Багародзічны.* Суцішы боль душы маёй, Ты, што асушаеш усякую сьлязу з твару зямлі, сунімаеш усялякі боль людзей, і сум грэшнікаў разьвейваеш. Мы ўсе знайшлі надзею і ўмацаваньне ў Табе, усесьвятая Маці Дзева.

## АЎТОРАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Узьнесены, быццам Ягнё, на крыжы, Ты нізьверг гордасьць хітрага ворага; забіты, Ты крывёю сваёю асьвяціў усю зямлю; прабіты кап'ём, Ты, Хрысьце, загадаў вогненнаму мячу адступіцца і даць мне ўваход у рай, каб пакаштаваць бяз страху з дрэва жыцьця. Збаўлены мукамі Тваімі, радасна клічу: "Слава Боскаму крыжу Твайму, якім я быў вызвалены ад першаснага праклёну, атрымаў блаславеньне з дрэва жыцьця і веліч зьмілаваньня!"

Каб суняць боль людзкі і зьнявагі, Ты, добры Госпадзе і Збавіцелю мой, пацярпеў ганебнае расьпяцьце. Сам нязлосны, Ты, Слова, пакаштаваў жоўці, каб адняць горыч нашай злосьці; быў паранены кап'ём у бок, каб ацаліць нашыя раны. Дзеля гэтага пакланяемся Твайму слаўнаму жаданьню і аддаем пашану кап'ю, губцы і трысьціне, якімі Ты дараваў сьвету супакой і веліч зьмілаваньня.

"Як гэта Цябе, літасьцівы Ісусе, зборышча беззаконных бязьлітасна асудзіла на ўкрыжаваньне? — Дзева з плачам казала, калі

ўбачыла ўзьнесенага на крыжы Цябе, якога Яна нарадзіла бяз болю. — Што яны ўчынілі Табе, Дзіця маё жаданае, Сыне мой любы? Сьпяшайся і, як абяцаў, у дабрыні Тваёй, збаў тых, што славяць расьпяцьце Тваё і ўзьвялічваюць мяне!"

*Крыжабагародзічны.* Убачыўшы Ягнё сваё, што сьпяшалася на сьмерць, Маці Ягоная пайшла за Ім і з плачам казала: "Куды ідзеш, Хрысьце, Дзіця маё любае? Чаму сьпяшаешся ісьці гэтым шляхам, Даўгацярплівы? Ісусе жаданы, бязгрэшны і шматміласэрны Госпадзе, Сыне мой, дай слова мне, слузе Тваёй, не збывай маўчаньнем мяне, што ў невыказны спосаб нарадзіла Цябе — Жыцьцядаўца Бога, — які даеш сьвету веліч зьмілаваньня."

**Вершапесьні**

Некалі за Майсея прарока вобраз крыжа Твайго, Госпадзе, ворагаў перамагаў; сёньня ж мы, маючы на дапамогу сам крыж Твой, просім: "Умацуй царкву Тваю і даруй ёй перамогу, як некалі Канстантыну, у вялікай міласэрнасьці Тваёй."

Крыж Твой, Хрысьце, хоць зроблены з дрэва, апрануты ў Боскую моц, зьзяе на ўвесь сьвет і зьдзяйсьняе цудоўна нашае збаўленьне. Таму пакланяемся яму і славім Цябе, Збавіцелю. Зьмілуйся над намі!

Маліцеся за нас, сьвятыя мучанікі, каб нам выбавіцца ад беззаконьняў нашых, бо вам дадзеная ласка маліцца за нас.

*Крыжабагародзічны.* Узяўшы мой выгляд, Госпад і Бог апрануўся ў яго, каб упадобніцца да паўшага раней Адама. Ён узьняўся дабравольна на крыж, быццам вінаваты, рукі распасьцёр на ім, каб ацаліць рукі, што некалі аслабелі, калі пацягнуліся да дрэва спакусы. Усячыстая, угледзеўшы Яго, усклікнула: "Што гэта, Сыне мой, за невыказнае даўгацярпеньне? Не магу бачыць на крыжы Цябе, які ў руцэ сваёй трымаеш усе канцы зямлі."

## СЕРАДА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Вучні Гасподнія, вы абышлі ўсю зямлю, несучы з сабою скарб ваш, быццам сьветач, і пасеялі Боскае вучэньне, якім вы пасаромілі ўладароў і мучыцеляў і разарвалі, быццам павуціну, мудрагельства красамоўцаў і філёзафаў, клічучы ўсіх да пазнаньня Творцы, і адмяняючы ідальскія служэньні. Дзеля

гэтага малю вас выбавіць мяне ад бяздумных пажаданьняў малітвамі вашымі.

Ад буры спакусаў і маны нязбожных вучэньняў, злых бесаўскіх нашэптаў і прыкрых людзкіх напасьцяў і закалотаў, агню беспрасьветнага і вечнага чэрвя, скрыгату зубоў і ўсіх іншых мукаў малітвамі вашымі да Бога выбаўце, блаславёныя, усіх нас, і прасіце Яго, каб, дзякуючы вашым подзьвігам і дабрадзейнасьцям, атрымаць нам у спадчыну нябеснае валадарства і веліч зьмілаваньня.

Наколькі магчыма людзкой прыродзе, усяхвальныя дванаццаць апосталаў, невыказным провідам успрынялі зьзяньне Тройцы і паказалі сябе адной згоднай грамадой. Разам з сямідзесяцьцю іншых вучняў, яны прасьвятлілі ўсе куткі зямлі, што былі агорнутыя змрокам ілжывых вучэньняў, і цяпер моляць Хрыста дараваць сьвету веліч зьмілаваньня.

*Багародзічны.* Радуйся, прароцкая пячаць і апосталаў багамудрых прапаведаваньне, бо Ты, Чыстая, вышэй за розум і словы, нарадзіла ў целе існага Бога. Праз Яго мы вярнуліся да першаснага стану і асалоды райскай спажы. Славім Цябе, Усячыстая, як хадайніцу такое ласкі і заступніцу, прыемную Богу, і, узбагачаныя Табою, удастойваемся вечнага жыцьця Сына Твайго, які дае ўсім багацьце зьмілаваньня.

**Вершапесьні**

Вучні Збавіцеля, сьведкі тайніцаў Божых, вы прапаведавалі Нябачнага і Спрадвечнага, кажучы: "Спачатку было Слова." Вы не былі створаныя раней за анёлаў і не навучыліся ад людзей, але ад Найвышэйшае Мудрасьці. Малецеся цяпер за душы нашыя.

Апосталаў Хрыстовых згодна ў песьнях уславім, бо яны, апрануўшыся ў крыжовую зброю, ідальскую спакусу перамаглі і атрымалі пераможныя вянцы. Малітвамі іх і ўсіх сьвятых, Божа, зьмілуйся над намі.

У бязьмежнай любові вы, сьвятыя мучанікі, ня выракліся Хрыста: пацярпеўшы розныя мукі і раны, вы перамаглі дзёрзкасьць мучыцеляў і, захаваўшы чыстай і непашкоджанай веру, пераставіліся да неба. Цяпер, маючы ласку ў Бога, прасіце Яго дараваць нам веліч зьмілаваньня.

*Багародзічны.* Славім і ўзьвялічваем Цябе, Багародзіца Дзева, як горад непахісны, сьцяну непарушную, моцную заступніцу і прыстанішча душаў нашых.

## ЧАЦЬВЕР УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Усе дрэвы дуброўныя хай цешацца, бачачы, як пачэснае дрэва, асьвячанае мукамі Гасподнімі, зьзяе ласкаю, быццам полымя агню, і крынічыць усім дараваньні, што прасьвятляюць душы і думкі, ацаляюць немачы і сунімаюць цярпеньні, адганяюць нябачных ворагаў, перамагаюць супраціўнікаў і даюць Царкве перамогу, а верным — блаславеньне і веліч зьмілаваньня.

Пакланяемся з вераю месцу, дзе стаялі ногі Гасподнія, як сказаў прарок; славім расьпятага Хрыста, бо Ён расьпяў з сабою правіны нашыя, зьнішчыў праклён дрэва і прымірыў з Айцом тых, што былі думкамі далёка ад Яго. У думках цалуем рукі і ногі Ягоныя — а таксама цьвікі, кап'ё, трысьціну, губку і цярновы вянок, — і з пашанаю схіляемся перад зьнявагамі і насьмешкамі і ўсім, што Ён за нас пацярпеў, бо праз іх мы атрымалі збаўленьне.

Распнем усе нашыя члены з Хрыстом і памрэм для сьвету, каб ісьці па Ягоных сьлядах; ускладзем на плечы Ягоны Боскі крыж, адкінем цялесныя хістаньні і дрэнныя пажаданьні, якія цягнуць душу да граху. Глянем, як Ён, прыбіты да крыжа, аддае, задыхаючыся, душу сваю ў рукі Айца, каб нам быць з Ім вечна і неразлучна.

*Крыжабагародзічны.* Вялікі выкуп і дарагую цану — найчыстую кроў Тваю, — Ты, Хрысьце мой бязгрэшны, захацеў даць, каб збавіць усіх. Дзеля гэтага Маці Твая, калі ўбачыла Цябе расьпятым, распусьціўшы валасы, заплакала і загаласіла: "Сыне мой, Ягнё беззаганнае, Ты жадаеш збавіць сьвет Тваёю найчыстаю крывёю! Незьмяркальнае Сонца, што дае ўсім прасьвятленьне і веліч зьмілаваньня, чаму Ты зайшоў для вачэй маіх?"

**Вершапесьні**

Некалі за Майсея прарока вобраз крыжа Твайго, Госпадзе, ворагаў перамагаў; сёньня ж мы, маючы на дапамогу сам крыж Твой, просім: "Умацуй царкву Тваю і даруй ёй перамогу, як некалі Канстантыну, у вялікай міласэрнасьці Тваёй."

Крыж Твой, Хрысьце, хоць зроблены з дрэва, апрануты ў Боскую моц, зьзяе на ўвесь сьвет і зьдзяйсьняе цудоўна нашае збаўленьне. Таму пакланяемся яму і славім Цябе, Збавіцелю. Зьмілуйся над намі!

Ня дбаючы пра дачаснае і наважыўшыся мужна на мукі, вы, слаўныя мучанікі, ня страцілі надзеі блаславёных і атрымалі ў спадчыну нябеснае валадарства. Маючы ласку ў чалавекалюбнага Бога, выпрасіце сьвету супакой і душам нашым веліч зьмілаваньня.

*Крыжабагародзічны.* Дзева Маці і беззаганная Нявеста, убачыўшы Ягнё і Сына свайго, узьнесенага на крыжы, усклікнула з плачам: "Гора мне, Сыне мой! Як гэта Ты паміраеш, будучы па прыродзе сваёй несьмяротным Богам?"

## ПЯТНІЦА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Шматпакутныя мучанікі струменямі крыві сваёй патушылі бяздумнасьць нязбожнасьці і запалілі сьвятло дабрадзейнасьці. Яны спалілі ілжывых ідалаў і іхняе агіднае кадзіла і сьвятыні, і зазьзялі людзям, як праўдзівае сьвятло. Прасьветленыя імі, цураемся нязбожнай цемры і ідальскай маны і пакланяемся Хрысту, які дае сьвету веліч зьмілаваньня свайго.

Зьнішчыўшы зманлівыя навукі ілжывых настаўнікаў, вы сталіся воямі спрадвечнага Айца, і Сына роўнаспрадвечнага, і Духа Сьвятога, разумна прапаведуючы ў трох асобах адзінага Бога, і ўмацоўваючы праўдзівае вучэньне; дзеля гэтага шануем вас, пастыры сьвятыя, што на жыцьцядайнай пашы пасьвілі статак Хрыстовы і пацярпелі за Яго разнародныя беды і прыкрасьці.

Хор сьвятых падзьвіжнікаў, узяўшы розум за праваднікa для дабрадзейнага жыцьця, лёгка перамог цялесныя пажаданьні. Жывучы на зямлі як бесьцялесныя, яны зьнішчылі бесаўскую ману, і сталіся спаўжыхарамі анёлаў, з якімі цяпер радуюцца ў нябесных сялібах, у сьвятле разам з Хрыстом, і моляць Яго даць нам веліч зьмілаваньня свайго.

*Дагматык.* У Чырвоным моры ... (*Гл. ст. 37*)

**Вершапесьні**

Маліцеся за нас, сьвятыя мучанікі, каб нам вызваліцца ад беззаконьняў нашых, бо вам дадзеная ласка маліцца за нас.

У бязьмежнай любові вы, сьвятыя мучанікі, ня выракліся Хрыста: пацярпеўшы розныя мукі і раны, вы перамаглі дзёрзкасьць мучыцеляў і, захаваўшы чыстай і непашкоджанай веру,

пераставіліся да неба. Цяпер, маючы ласку ў Бога, прасеце Яго дараваць нам веліч зьмілаваньня.

Засланіўшыся шчытом веры і ўмацаваўшы сябе знакам крыжа, сьвятыя Твае, Госпадзе, адважна выйшлі на змаганьне і перамаглі д'ябальскую гордасьць і ману. Малітвамі іх, Божа ўсемагутны, даруй сьвету супакой і душам нашым багацьцьце Твайго зьмілаваньня.

*Багародзічны.* Малітвамі Тваімі, Поўная ласкі, заступайся за нас і выпрасі душам нашым багацьце дабротаў і ачышчэньне правінаў, молімся Табе.

# ТОН ШОСТЫ

## СУБОТА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Ты перамог пекла, Хрысьце Божа, узышоўшы на крыж, каб уваскрасіць з сабою тых, што сядзелі ў сьмяротнай цемры, і, сам свабодны ад сьмерці, ад Твайго сьвятла даеш усім жыцьцё. Усемагутны Збаўцелю, зьмілуйся над намі!

Сёньня Хрыстос, уваскросшы, перамог сьмерць, як прадказаў, і дараваў радасьць сьвету ўсяму. Дзеля гэтага голасна пяём: "Крыніца жыцьця, Сьвятло недасяжнае, зьмілуйся над намі!"

Дзе нам схавацца ад Цябе, Госпадзе, бо Ты ж прысутны ва ўсім стварэньні: у небе Ты жывеш; у пекле Ты перамог сьмерць; у глыбіні марской — і там рука Твая, Уладару. Да Цябе прыбягаем і, прыпадаючы, молімся: "Госпадзе, што ўваскрос з мёртвых, зьмілуйся над намі!"

Крыжом Тваім, Хрысьце, хвалімся і ўваскрасеньне Тваё ў песьнях славім, бо Ты Бог наш, апроч Цябе іншага бога ня знаем.

Слава сіле Тваёй, Госпадзе, бо Ты перамог таго, хто меў сьмерці ўладу, і абнавіў нас крыжом Тваім, даруючы жыцьцё і нятленнасьць.

Заўжды благаслаўляем Госпада і славім уваскрасеньне Яго, бо Ён, пацярпеўшы на крыжы, сьмерцю сьмерць перамог.

Пахаваньнем Тваім, Госпадзе, Ты зьнішчыў аковы пякельныя, разьбіўшы іх, і Тваім уваскрасеньнем з мёртвых Ты прасьвятліў увесь сусьвет. Госпадзе, слава Табе!

*Дагматык.* Хто Цябе не назаве шчасьліваю, Найсьвятая Дзева, хто ня будзе славіць, Чыстая, мацярынства Тваё? Адзінародны Сын, што спрадвеку зазьзяў ад Айца, ад Цябе, прыняўшы цела, у невыказны спосаб нарадзіўся. Праўдзівы Бог, Ён стаўся праўдзівым чалавекам дзеля нас, непадзельны на дзьве асобы, але ў дзьвюх нязьлітных прыродах пазнавальны. Малі Яго, Чыстая і Благаслаўлёная, даць зьмілаваньне душам нашым.

**Вершапесьні**

Уваскрасеньню Твайму, Хрысьце Спасе, анёлы ў небе пяюць песьню хвалы: дай і нам тут на зямлі з чыстым сэрцам славіць Цябе.

*Верш.* Госпад пануе, Ён aпрануўся ў красу. Апрануўся Госпад у сілу і падперазаўся.

Разваліўшы пякельныя вароты і разьбіўшы медныя замкі, Ты, як усемагутны Бог, уваскрасіў з сабою род людзкі. Дзеля гэтага мы аднадушна ўсклікаем: "Госпадзе, што ўваскрос з мёртвых, слава Табе!"

*Верш.* Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца.

Каб узьняць нас з даўняй тленнасьці, Хрыстос даў сябе прыбіць да крыжа і пахавацьу магіле. Жанчыны-міраносіцы шукалі Яго са сьлязьмі і, плачучы, казалі: "Гора нам, Збавіцелю наш! Як гэта Ты пасяліўся ў магіле і, пасяліўшыся, як Ты быў украдзены; якім чынам быў забраны адсюль; якое месца скрывае Тваё жыцьцядайнае цела? Зьявіся нам, Уладару, як абяцаў!" Калі яны так плакалі, анёл адазваўся да іх: "Спыніце плач і ідзіце абвясьціць апосталам добрую вестку, што Госпад уваскрос!"

*Верш.* Дому Твайму належыцца сьвятасьць, Госпадзе, праз усе дні.

Ты быў дабравольна прыбіты да крыжа, і паланіў пекла пахаваньнем Тваім, і як Бог уваскрос у славе на трэці дзень, даруючы сьвету бясконцае жыцьцё і багацьце Твайго зьмілаваньня.

*Багародзічны.* Творца і Збавіцель мой, Усячыстая, Госпад Ісус Хрыстос, выйшаўшы з Твайго ўлоньня, у мяне апрануўся і ад першага Адамавага праклёну вызваліў мяне. Дзеля гэтага Табе, Багародзіца, Маці Божая і Дзева, разам з анёламі нязмоўкна ўсклікаем: "Радуйся!." Радуйся, Уладарка, Заступніца, Абарона і Збаўленьне душаў нашых!

**Адпушчальны трапар уваскросны**

***Увага:** Спосаб сьпяваньня трапароў у суботу ўвечары гл. ст. 5.*

*Уваскросны.* Угледзеўшы анёлаў на магіле Тваёй, вартаўнікі амярцьвелі; і, стоячы ля магілы, Марыя шукала ўсячыстае цела Тваё. Ты паланіў пекла, застаўшыся някранутым ім, выйшаў сустрэць Дзеву, сьвету Жыцьцё. Госпадзе, што ўваскрос з мёртвых, слава Табе!

## НЯДЗЕЛЯ ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Дай мне, Збавіцелю, сьлёзы жалю і сэрца скрушлівае, каб абмыць нячыстасьць душы маёй, якую я апаганіў бясчынствамі: маю на абарону Маці Тваю і хоры анёлаў, якія моляцца за мяне, і Тваё чалавекалюбства.

Ідзі, душа мая, і кайся ў многіх грахох, якія ты ўчыніла, і са сьлязьмі і стогнамі прасі хоры анёлаў, каб табе быў дадзены час для пакаяньня, і каб ты, як бясплодная смакоўніца, не была ўкінутая ў вечны агонь.

Я не захаваў ніводнага з Тваіх запаветаў тут на зямлі, дык які дам адказ, калі зьяўлюся перад пасадам Тваім, Хрысьце мой, і які прысуд пачую за ўсё, што ўчыніў сьвядома і несьвядома? Дзеля гэтага клічу : "Малітвамі слугаў Тваіх збаў мяне, заблуднага."

*Багародзічны.* Ты, Багродзіца, што на голас арханёла зачала ва ўлоньні Слова, спрадвечнае з Айцом і Духам, ёсьць вышэйшая за ўсіх хэрувімаў і сэрафімаў, і за ўсе анельскія сілы.

**Вершапесьні**

У страшны дзень прыйсьця Твайго, Хрысьце, ня дай нам пачуць: "Ня ведаю вас", бо мы, Збавіцелю, усклалі ўсю надзею на Цябе, хоць і не захавалі запаветаў Тваіх дзеля нядбайства. Але Ты пашкадуй душы нашыя, молімся.

Ня маю сьлёзаў пакаяньня, дзеля гэтага малю Цябе, Хрысьце Божа, перш чым прыйдзе канец, навярні мяне і дай мне жаль за грахі, каб мне выбавіцца ад мукаў.

Мучанікі Твае, Госпадзе, ня выракліся Цябе і не адступілі ад запаветаў Тваіх. Малітвамі іх зьмілуйся над намі.

*Багародзічны.* З арханёлам усхвалім, верныя, Нябесны Хорам, і Браму зачыненую, кажучы: "Радуйся Ты, дзякуючы якой зьявіўся для нас Збаўца ўсіх Хрыстос Жыцьцядавец і Бог. Перамагай, Уладарка, рукою Тваёю мучыцёляў і ворагаў нашых, бо Ты, Усячыстая, надзея ўсіх хрысьціян."

## ПАНЯДЗЕЛАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Хто не заплача, гледзячы на мяне? У няўстрыманасьці маёй я пераступіў запаветы Найвышэйшага і замест раю пасяліўся ў пекле, а пагоняю за асалодаю заслужыў на сьмерць і стаўся чужым для Божай славы і жыцьця. Але прымі мяне, які каюся, Госпадзе Чалавекалюбча, у вялікай міласэрнасьці Тваёй.

Глянь, Госпадзе, на мой сум і боль: безьліч грахоў чыняць закалот у душы маёй і ўводзяць розум у недаўменьне. Пачуй мяне, зьняверанага і асуджанага і дай мне дух скрушлівы і пакорнае сэрца, крыніцу сьлёз і прабачэньне грахоў у вялікай міласэрнасьці Тваёй.

Божа, які жадаеш збаўленьня ўсім людзям, глянь на мяне і выслухай малітву маю, і не адкінь маіх сьлёз: хто калі прыходзіць да Цябе з плачам і не бывае збаўлены, або хто, паклікаўшы Цябе шчыра, ня будзе выслуханы? Бо Ты, Уладару, гатовы памагчы ўсім, якія Цябе просяць, у бязьмежнай міласэрнасьці Тваёй.

*Багародзічны.* Пакажы, Усячыстая, мне, няшчаснаму, мора чалавекалюбства Твайго, бездань добрасардэчнасьці і веліч спагадлівасьці Тваёй, суцішы грахоўныя хістаньні і захавай душу і цела беззаганнымі, бо Ты ж нарадзіла Збавіцеля.

**Вершапесьні**

У страшны дзень прыйсьця Твайго, Хрысьце, ня дай нам пачуць: "Ня ведаю вас", бо мы, Збавіцелю, усклалі ўсю надзею на Цябе, хоць і не захавалі запаветаў Тваіх дзеля нядбайства. Але Ты пашкадуй душы нашыя, молімся.

Ня маю сьлёзаў пакаяньня, дзеля гэтага малю Цябе, Хрысьце Божа, перш чым прыйдзе канец, навярні мяне і дай мне жаль за грахі, каб мне выбавіцца ад мукаў.

Пакутныя мучанікі, нябесныя грамадзяне, перанесьлі незьлічоныя мукі і шмат пацярпелі на зямлі. Малітвамі іх, Госпадзе, усіх нас захавай.

*Багародзічны.* Ніхто, што прыходзіць да Цябе, не адыходзіць пасаромлены, Найчыстая Дзева, але просіць ласкі і атрымлівае дары згодна з просьбаю.

## АЎТОРАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Расьпяцьцем Тваім, даўгацярплівы Госпадзе, ты пахіснуў зямлю і ўмацаваў сэрцы верных; дзеля гэтага славім Цябе і з любоўю пакланяемся бязьмежнай сіле Тваёй.

Калі Цябе, Хрысьце, білі па твары і аплёўвалі, Ты аплявушыў злога і лютага ворага і вярнуў Адама да першага стану, з якога ён быў абакрадзены грэшным позіркам.

Сонца памеркла, зямля захісталася і камяні раскалоліся, калі ўбачылі Цябе, Збавіцелю, які прабачаеш грахі, павешаным няправедна на крыжы.

*Крыжабагародзічны.* Калі чыстая Дзева і Маці Твая, Збавіцелю, бачыла, як беззаконныя людзі прыбілі Цябе да крыжа несправядліва, душа Яе была параненая, як прадказаў некалі Сямён.

**Вершапесьні**

Крыж Твой, Госпадзе, ёсьць жыцьцё і заступніцтва для людзей Тваіх: спадзеючыся на яго, славім Цябе, расьпятага целам Бога нашага. Зьмілуйся над намі!

Крыж Твой, Госпадзе, рай адчыніў роду людзкому, і мы, вызваленыя ад тленнасьці, славім Цябе, расьпятага целам Бога нашага. Зьмілуйся над намі.

Пакутнікі Твае, Хрысьце, шматлікія мукі пацярпелі дзеля Цябе і, атрымаўшы ў небе вянец перамогі, моляцца за душы нашыя.

*Крыжабагародзічны.* Калі беззаганная Багародзіца ўбачыла, як Жыцьцё наша вісіць на дрэве, Яна па-матчынаму заплакала і ўсклікнула: "Сыне і Божа мой, збаў тых, што з любоўю славяць Цябе!"

## СЕРАДА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Як слугі вялікіх тайніцаў і сьведкі Божыя, вы, багасловы і вучні Гасподнія, атрымалі ласку ацаленьняў і лечыце немачы людзей.

Багавідцы апосталы Гасподнія, вы — надзейнае прыстанішча і ахова душаў нашых, і абарона ад лютых духаў. Дзеля гэтага вас заўжды славім.

Ад усялякай загрозы, бесаўскіх нашэптаў, правінаў і лютай няволі выбаўляйце тых, што з вераю славяць вас, боскія блаславёныя апосталы.

*Багародзічны.* Люты вораг, поўны зайздрасьці, усё змагаецца супраць статку Твайго, Усячыстая, каб прыдбаць сабе спажыву; але Ты, Багародзіца, выбаў нас ад такой бяды.

**Вершапесьні**

Некалі Апосталы Твае, Госпадзе, даставалі сецямі да дна марскога, а цяпер вучэньнем дасягаюць вяршыні валадарства; раней яны ўмела дасьледвалі глыбіню, цяпер вераю спазналі недасьледную існасьць Тваю, і сьвету прапаведавалі Твайго спрадвечнага Сына. Малітвамі іх і ўсіх сьвятых зьмілуйся над намі!

Калі бура кідала чаўном, у якім былі вучні Твае, Хрысьце, яны закрычалі: "Настаўнік, збаў нас, бо гінем!" А цяпер мы клічам: "Чалавекалюбны Збавіцелю наш, молімся, вызваль нас ад бедаў нашых."

Крыж Твой, Госпадзе, стаўся для мучанікаў Тваіх зброяю непераможнаю, бо бачылі яны блізкую сьмерць, а прадбачылі будучае жыцьцё, і ўмацоўваліся надзеяю на Цябе. Малітвамі іх зьмілуйся над намі.

*Багародзічны.* Уздымаю вочы сэрца майго да Цябе, Уладарка, не пагардзі маімі пакорнымі ўздыханьнямі, калі Сын Твой судзіць будзе сьвет, але будзь мне покрывам і заступніцай.

## ЧАЦЬВЕР УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Спакушаны дрэвам, праайцец быў асуджаны; але Хрыстос, расьпяты на дрэве, адмяніў ягоны прысуд; і калі той пакаяўся, узяў яго на плечы і пасадзіў поруч з сабою на пасадзе, разам з Айцом і Сьвятым Духам.

Дай мне, Хрысьце мой, волю пакаяцца, і зрабі, каб я заўжды ў думках і сэрцы меў Твае пачэсныя мукі, якія Ты перанёс дзеля нас

і якімі мяне прасьвятліў; жадаю стаяць, плачучы, ля крыжа Твайго і ўзірацца на Цябе, ахвярнае Ягнё.

Зямля спалохалася, небасхіл памерк, убачыўшы Бога, зьняважанага слугою. Закрывае на дрэве вочы Той, хто пагрозьлівым словам разбурае горы, і адным позіркам сушыць бездані; і Той, хто далоньню абдымае ўсё жывое, стаецца мёртвы і бяздушны целам.

*Крыжабагародзічны.* Убачыўшы на крыжы народжанае ад Цябе Ягнё, Ты, Багародзіца чыстая, са сьлязьмі ўсклікнула : "Гора мне, любае Дзіця маё! Некалі я бяз болю нарадзіла Цябе, а цяпер нясьцерпны боль працаў сэрца маё, і не магу глядзець на Цябе расьпятага, Хрысьце, Сыне мой шматміласэрны."

**Вершапесьні**

Крыж Твой, Госпадзе, ёсьць жыцьцё і заступніцтва для людзей Тваіх: спадзеючыся на яго, славім Цябе, расьпятага целам Бога нашага. Зьмілуйся над намі!

Крыж Твой, Госпадзе, рай адчыніў роду людзкому, і мы, вызваленыя ад тленнасьці, славім Цябе, расьпятага целам Бога нашага. Зьмілуйся над намі.

Мучанікі Твае, Госпадзе, ня выракліся Цябе і не адступілі ад запаветаў Тваіх. Малітвамі іх зьмілуйся над намі!

*Крыжабагародзічны.* Калі Маці Твая, Хрысьце, убачыла, як Цябе расьпінаюць на крыжы, Яна ўсклікнула: "Што гэта за страшную тайну бачу я, Сыне мой? Як гэта, Ты, што даеш жыцьцё, паміраеш, павешаны на дрэве?"

## ПЯТНІЦА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Пераймаючы Хрыстовыя цярпеньні, хоры мучанікаў адважна выйшлі на вялікія подзьвігі, прапаведуючы Бога перад нязбожнымі мучыцелямі і беззаконнымі ўладарамі, і шмат пацярпелі ў надзеі нябеснага шчасьця. Сёньня яны радуюцца з анёламі, прабываючы разам з Госпадам.

Сьвятыя пастыры, вы прыпадобніліся першаму Пастыру Хрысту, зьберагалі непарушным боскі скарб праўдзівай веры, прагналі лютых ваўкоў і прывялі верны статак у нябесную загарадзь, дзе самі цяпер прабываеце. Памятайце пра тых, хто з

любоўю славіць вас і, цешачыся вялікім даверам у Хрыста, маліце Яго за збаўленьне душаў нашых.

Пажыўшы праведна, вы, сьвятыя і блаславёныя айцы, перамаглі нячыстых духаў, адважна перанесьлі душэўныя мучэньні і патушылі жар пажаданьняў. Сёньня вы прабываеце ў радасьці разам з анёламі, да якіх вы, калі былі яшчэ ў целе, прыпадобніліся сваім жыцьцём. Разам з імі маліце добрага Бога, каб ня даў упасьці тым, што шануюць вас.

*Дагматык.* Хто Цябе не назаве ... (*Гл. ст.46*)

**Вершапесьні**

Пакутнікі Твае, Хрысьце, шмат пацярпелі і, атрымаўшы ў небе вянкі перамогі, моляцца за душы нашы.

Мучанікі Твае, Госпадзе, ня выракліся Цябе і не адступілі ад запаветаў Тваіх. Малітвамі іх зьмілуйся над намі.

Пакутныя мучанікі, нябесныя грамадзяне, перанесьлі незьлічоныя мукі і шмат пацярпелі на зямлі. Малітвамі іх, Госпадзе, усіх нас захавай.

*Багародзічны.* Малітвамі, Госпадзе, Маці Тваёй, мучанікаў Тваіх і апосталаў, прарокаў і сьвятаначальнікаў, посьнікаў і праведных супакой души заснуўшых слугаў Тваіх.

# ТОН СЁМЫ

## СУБОТА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Прыйдзіце, будзем радавацца ў Госпадзе, які зьнішчыў сьмерці дзяржаву і прасьвятліў род людзкі. Разам з анёламі ўсклікнем: "Творца і Збавіцелю наш, слава Табе!"

Ты, Збавіцелю, пацярпеў крыж і пахаваньне і, як Бог, сьмерцю сьмерць умярцьвіў. Дзеля гэтага пакланяемся Твайму трохдзённаму ўваскрасеньню. Госпадзе, слава Табе!

Апосталы, убачыўшы ўваскрасеньне Творцы, дзіву даліся і разам з анёламі засьпявалі песьню хвалы: "Вось слава царкоўная, вось скарбніца валадарства!" Госпадзе, які пацярпеў за нас, слава Табе!

Хоць беззаконныя людзі схапілі Цябе, Хрысьце, не саромлюся вызнаваць, што Ты — мой Бог; білі Цябе па плячох, і я не адракаюся; не хаваю і таго, што Ты быў прыбіты да крыжа. Уваскрасеньнем Тваім хвалюся, бо Твая сьмерць — для мяне жыцьцё. Усемагутны і чалавекалюбны Госпадзе, слава Табе!

Спаўняючы Давідава прароцтва, Хрыстос адкрыў сваю веліч вучням Ягоным у Сыёне і явіў сябе роўным славаю з Айцом і Духам Сьвятым. Спрадвечны, як Слова бесьцялеснае, Ён у апошні час прыняў цела дзеля нас і, памёршы як чалавек, уваскрос у сіле як Чалавекалюбец.

Ты зышоў да пекла, Хрысьце, як сам захацеў, і, як Бог і Ўладар, зьнішчыў сьмерць, уваскрос на трэці дзень і ўзьняў з сабою Адама; і той, вызвалены ад аковаў пякельных і ад тленнасьці, усклікнуў: "Слава ўваскрасеньню Твайму, адзіны Чалавекалюбча!"

Ты быў пакладзены ў магілу, Госпадзе, быццам заснуўшы, і ўваскрос на трэці дзень у сіле і славе, і як усемагутны узьняў з сабою Адама ад сьмяротнай тленнасьці.

*Дагматык.* Ты, Багародзіца, сталася Маці ў надпрыродны спосаб, застаўшыся невыказна і невытлумачальна Дзеваю, і язык няздольны перадаць цуд мацярынства Твайго. Дзівоснае было зачацьце Тваё, Усячыстая, бо калі Бог хоча, адмяняецца прыродны лад. Дзеля гэтага мы ўсе горача просім Цябе як Маці Божую: "Маліся за збаўленьне душаў нашых."

**Вершапесьні**

Ты ўваскрос з магілы, Збаўца сьвету, і разам з целам Тваім уваскрасіў род людзкі. Госпадзе, слава Табе!

*Верш.* Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу. Апрануўся Госпад у сілу і падпеpазаўся.

Прыйдзіце, паклонімся Таму, хто ўваскрос з мёртвых і прасьвятліў усіх: сваім уваскрасеньнем на трэці дзень Ён вызваліў нас ад пякельных пакутаў і дараваў нам жыцьцё і багацьце зьмілаваньня.

*Верш.* Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца.

Зышоўшы да пекла, Ты, Хрысьце, сьмерць паланіў і, уваскросшы на трэці дзень, узьняў з сабою ўсіх нас. Славім Тваё магутнае ўваскрасеньне, Госпадзе Чалавекалюбча!

*Верш.* Дому Твайму належыцца сьвятасьць, Госпадзе, праз усе дні.

Страшна было бачыць Цябе, Госпадзе, калі Ты ляжаў у магіле, быццам заснуўшы. Але на трэці дзень Ты ўваскрос у сіле і ўзьняў з сабою Адама, які ўсклікнуў радасна: "Слава ўваскрасеньню Твайму, Чалавекалюбча!"

*Багародзічны.* Пад Тваю апеку, Уладарка, уцякаем мы ўсе, зямныя, клічучы: "Багародзіца, надзея наша, выбаў нас ад незьлічоных правінаў і збаў душы нашыя!"

**Адпушчальныя трапары**

*Увага: Спосаб сьпяваньня трапароў у суботу ўвечары гл. ст. 5.*

*Уваскросны.* Ты зьнішчыў крыжам Тваім сьмерць, адкрыў разбойніку рай, міраносіцам плач на радасьць перамяніў і апосталам загадаў прапаведаваць, што Ты ўваскрос, Хрысьце Божа, даруючы сьвету багацьце Твайго зьмілаваньня.

## НЯДЗЕЛЯ ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Уздымі вочы, душа мая! Глянь на Божы провід і чалавекалюбства, як Ён, нахіліўшы неба, зышоў на зямлю, каб вырваць цябе з лютай няволі пажаданьняў тваіх і паставіць на камені веры.

Дзіўны і страшны цуд! Слава Табе, які спустошыў сябе дзеля нас, Чалавекалюбча!

Глянь, душа мая, на твае беззаконныя ўчынкі, і дзівіся, як гэта цябе зямля носіць? Як яна не расступіцца, каб праглынуць цябе, як дзікія зьвяры не разьдзяруць цябе; як гэта сонца не перастае сьвяціць табе? Устань, пакайся і ўсклікні Госпаду: "Зграшыла я, зграшыла. Зьмілуйся нада мною!"

Спадзеючыся на Цябе, усемагутны Госпадзе, молім Цябе: "Выбаў нас ад усякіх бедаў, небясьпекі і цяжкасьцяў, каб нам правесьці ў супакоі жыцьцё наша і, пажыўшы ў чысьціні, знайсьці Цябе, Міласэрнага Ўладара, прыхільным да нас у судны дзень."

*Багародзічны.* Разам з анёламі ўсхвалім Багародзіцу, якая нарадзіла Збаўцу сьвету, і пасьля родаў засталася Дзеваю; сынараджэньнем сваім Яна выбавіла сьвет ад спакусы і, будучы карміцелькай Вызваліцеля душаў нашых, дала нам спажыву жыцьця вечнага.

**Вершапесьні**

Як блудны сын, прыходжу да Цябе, добры Божа: прымі мяне, як аднаго з наймітаў Тваіх, Чалавекалюбча, і зьмілуйся нада мною.

Быццам той, што трапіў у рукі разбойнікаў і быў паранены імі, так я ўпаў у грахі многія і пакалечыў душу маю. Да каго ўцяку, вінаваты? Хіба толькі да Цябе, добрасардэчнага Лекара душаў: вылі на мяне, Божа, веліч зьмілаваньня Твайго.

Слава Табе, Хрысьце Божа, апосталаў хвала і радасьць мучанікаў, якія прапаведавалі адзінасутную Тройцу.

*Багародзічны.* Разам з анёлам усклікаем Табе, Дзева Маці: "Радуйся!", і завем Цябе Хорамам і Брамаю, Пасадам вогненным і Гарою нясечанаю, і незгаральным Кустом.

## ПАНЯДЗЕЛАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Уладару і Божа ўсяшчодры, вядомымі Табе шляхамі дай, каб страх Твой пасяліўся ў сэрцы маім, каб я саромеўся ўчынкаў нячыстых і, палюбіўшы Цябе ад усёй душы, чыніў Тваю збаўленную волю, бо Ты Бог наш, які сказаў: "Прасеце і атрымаеце."

Я стаўся пацехаю для бесаў, сорамам для людзей, плачам для праведных і анёлаў і нечысьцю для паветра, зямлі і вады; апаганіўшы цела і забрудзіўшы душу і розум бязьлікімі злымі ўчынкамі, я стаўся ворагам Божым. Гора мне, Госпадзе, зграшыў я, зграшыў, але Ты прабач мне.

Малюся Табе, пацярпі мяне, Уладару, і не сьсячы сякераю сьмерці, і ня выкінь у агонь, быццам няплоднае дрэва; але ў чалавекалюбстве Тваім, Збавіцелю мой Хрысьце, дай мне час прынесьці плод пакаяньня і абмыць усе мае правіны.

*Багародзічны.* Радуйся, Усячыстая, пачэсны Скарб дзявоцтва; радуйся, Боская краса; радуйся, Дзева, верных збаўленьне; радуйся, Уладарка; радуйся, Дзева Маці.

**Вершапесьні**

Як блудны сын прыходжу да Цябе, добры Божа: прымі мяне як аднаго з наймітаў Тваіх, Чалавекалюбча, і зьмілуйся нада мною.

Быццам той, што трапіў у рукі разбойнікаў і быў паранены імі, так я ўпаў у шматлікія грахі і пакалечыў душу маю. Да каго ўцяку, вінаваты? Хіба толькі да Цябе, добрасардэчнага Лекара душаў: вылі на мяне, Божа, веліч зьмілаваньня Твайго.

Сьвятыя мучанікі, што мужна змагаліся і атрымалі ўзнагароду, маліцеся Госпаду за збаўленьне душ нашых.

*Багародзічны.* Радуйся, Уладарка, хмара, што зьмяшчала духоўнае і невыказнае Сонца; радуйся, сьвечка ясная; радуйся, залаты ліхтар! Табою, Усячыстая, Эва выбавілася ад праклёну. Маючы сьмеласьць у добрасардэчнага Сына Твайго і Бога, не пераставай, як добрая Маці, маліцца за нас.

## АЎТОРАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Дрэва выгнала мяне з раю, а цяпер, калі Ты, Хрысьце, быў расьпяты, дрэва зноў мяне да раю прывяло.

Страшны цуд: як гэта Творца стаў перад стварэньнем, быў асуджаны і расьпяты на збаўленьне людзям?

Крыжу Хрыстовы, радасьць анёлаў сьвятых, загуба для д'яблаў, збаў слуг тваіх.

*Крыжабагародзічны.* Найсьвятая Уладарка Дзева, Маці Хрыста, які ў міласэрнасьці сваёй даў сябе прыбіць да крыжа і выліў сьвету струмені жыцьця, малі Яго цяпер за збаўленьне душаў нашых: Ты нашая адзіная заступніца, сьцяна і прыстанішча; дзеля гэтага мы, верныя, прыбягаем пад апеку Тваю.

**Вершапесьні**

Спадзеючыся на крыж Твой, мы маем доступ да дрэва жыцьця. Госпадзе, слава Табе!

Павешаны на крыжы, Ты, адзіны несьмяротны, зьнішчыў сеці д'ябальскія. Госпадзе, слава Табе!

Мучанікі сьвятыя, вы ня дбалі пра дачаснае і сьмела прапаведавалі Хрыста на судах, і атрымалі ад Яго ўзнагароду за мукі. Маючы асаблівую ласку ў Бога ўсемагутнага, маліце Яго збавіць душы ўсіх нас, якія прыбягаем да вас.

*Крыжабагародзічны.* Калі Ты ўбачыла Сына Твайго на крыжы, сэрца твае, Усячыстая, было працятае болем.

## СЕРАДА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Слаўныя апосталы, вы, узараўшы плугам богапазнаньня ўсю зямлю, узрасьцілі мноства верных.

Разьвейце зіму маіх пажаданьняў і прасьвятліце мяне чыстым лагодным сьвятлом, бласлаўёныя апосталы.

Як вучні Слова, вы ад бяздумнасьці да пазнаньня Бога прывялі мноства народаў.

*Багародзічны.* Малітвы слугаў Тваіх, Усячыстая, занясі да Сына Твайго, каб Ён збавіў тых, каго стварыў.

**Вершапесьні**

Апосталы слаўныя, стаўпы царкоўныя, прапаведнікі праўды, ясныя сьветачы, агнём духоўным вы спалілі ўсякую ману і вераю прасьвятлілі род людзкі. Дзеля гэтага просім вас: "Маліце Бога і Збавіцеля нашага, каб Ён даў супакой сьвету і збавіў душы нашыя."

Апосталы Хрыстовыя, працаўнікі Збавіцеля, узяўшы крыж, быццам плуг, вы ачысьцілі зьдзірванелую ідальскай манаю зямлю і засеялі яе словам веры. Дзеля гэтага славім вас.

Усяхвальныя мучанікі, авечкі духоўныя, Богу прыемныя ахвяры цэлапальныя: вас зямля не змагла схаваць, а неба прыняла вас, і вы сталіся спаўжыхарамі анёлаў; дык разам з імі маліце, просім вас, Збавіцеля і Бога нашага, даць сьвету супакой і збавіць душы нашыя.

*Багародзічны.* Усхвалім адзіную Маці Бога Слова, якая пасьля родаў засталася чыстаю Дзеваю, і ўсклікнем: "Слава Табе!"

## ЧАЦЬВЕР УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Каб чалавека абагавіць, Ты, добры Хрысьце, стаўся чалавекам і быў укрыжаваны. Слава сіле Тваёй.

Калі зборышча юдэйскае засудзіла Цябе на ўкрыжаваньне, зямля затрэслася і сонца схавала сьвятло сваё.

Беззаконнае зборышча ўсклала цярновы вянок на Цябе, несьмяротны сьвяты Уладару, які з коранем вырываеш церне граху.

*Крыжабагародзічны.* "Я параненая мячом суму, бо бачу на крыжы Цябе, які на водах павесіў зямлю і расьцягнуў неба быццам шацёр; бачу Цябе расьцягнутага і павешанага, Любы мой, і жадала б лепш памерці сама. Зямля, ўскалыхніся і задрыжы!" — Усячыстая клікала з плачам.

**Вершапесьні**

Спадзеючыся на крыж Твой, мы маем доступ да дрэва жыцьця. Госпадзе, слава Табе!

Павешаны на крыжы, Ты, адзіны несьмяротны, зьнішчыў сеці д'ябальскія. Госпадзе, слава Табе!

Слава Табе, Хрысьце Божа, апосталаў пахвала, радасьць мучанікаў, якія прапаведавалі Тройцу адзінасутную.

*Крыжабагародзічны.* "Словы, пачутыя пры нараджэньні Тваім, Сыне мой, прынесьлі вялікую радасьць мне і надзею пацяшэньня сумным душам. Усё гэта перамянілася ў сум Тваім расьпяцьцем: сэрца маё поўнае болю, гора прыгнятае мяне і я гатовая памерці."

## ПЯТНІЦА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Мучанікі разьвеялі цемру бязбожжа і паказалі ўсім людзям сьвятло богапазнаньня.

Правымі вучэньнямі, быццам боскім зьзяньнем, вы асьвятляеце Царкву Гасподнюю, мудрыя пастыры.

Пасяліўшыся ў непраходных пустынях, вы, айцы сьвятыя, разарвалі бесаўскія сеці.

*Дагматык.* Ты, Багародзіца, сталася Маці... *(Гл. ст. 54)*

**Вершапесьні**

Мучанікі сьвятыя, вы ня дбалі пра дачаснае, сьмела прапаведавалі Хрыста на судах, і атрымалі ад Яго ўзнагароду за мукі. Маючы асаблівую ласку ў Бога ўсемагутнага, маліце Яго збавіць душы ўсіх нас, якія прыбягаем да вас.

Усяхвальныя мучанікі, авечкі духоўныя, Богу прыемныя ахвяры цэлапальныя: вас зямля не змагла схаваць, а неба прыняла вас, і вы сталіся спаўжыхарамі анёлаў; дык разам з імі маліце, просім вас, Збавіцеля і Бога нашага, даць сьвету супакой і збавіць душы нашы.

Мучанікі сьвятыя, што шмат пацярпелі і атрымалі вянец перамогі, маліцеся Госпаду за збаўленьне душ нашых.

*Багародзічны.* Даніла бачыў сьвятую Божую гару, і Ісая мудры прапаведаваў Цябе, Усячыстая, як Маці Божую, што зьмясьціла ў целе Бога, які стварыў Адама, і якога, бачачы ўцелаўлёным, хэрувімы тройчы сьвятымі галасамі славяць з трапятаньнем і моляць збавіць душы нашыя.

## ТОН ВОСЬМЫ

### СУБОТА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Вячэрнюю песьню і духоўную службу прыносім Табе, Хрысьце, бо Ты ў дабрыні Тваёй дараваў нам зьмілаваньне ўваскрасеньнем.

Госпадзе, Госпадзе, не адкінь нас ад твару Твайго, але ў дабрыні Тваёй даруй нам зьмілаваньне ўваскрасеньнем.

Радуйся, Сыёне сьвяты, маці ўсіх цэркваў, Божае жытло, бо ты першы атрымаў адпушчэньне грахоў уваскрасеньнем.

Слова, народжанае спрадвеку ад Бога Айца, у апошні час прыняло цела ад Тое, што мужа ня знала, і, сьмерць пацярпеўшы на крыжы, выбавіла памёрлага раней чалавека ўваскрасеньнем сваім.

Славім Тваё, Хрысьце, уваскрасеньне з мёртвых, якім Ты вызваліў Адамавы род ад пякельных мукаў і як Бог дараваў сьвету вечнае жыцьцё і багацьце Твайго зьмілаваньня.

Слава Табе, Хрысьце Спасе, Сыне Божы адзінародны, што быў прыбіты да крыжа і ўваскрос на трэці дзень!

Славім Цябе, Госпадзе, што дабравольна дзеля нас на крыжы пацярпеў, і пакланяемся Табе, усемагутны Спасе. Не адкінь нас ад Твару Твайго, але пачуй нас і збаў уваскрасеньнем Тваім, Чалавекалюбча!

*Дагматык.* Уладар нябесны дзеля любові да людзей на зямлі зьявіўся і з людзямі пажыў. Ён прыняў цела ад Чыстае Дзевы і, выйшаўшы з Ейнага ўлоньня, стаўся чалавекам. Ён Сын адзіны, двайны прыродаю, але не асобаю. Дзеля гэтага мы праўдзіва прапаведуем і вызнаем Хрыста Бога нашага як дасканалага Бога і дасканалага чалавека. Малі Яго, Дзева Маці, даць зьмілаваньне душам нашым.

**Вершапесьні**

Ты ўзышоў на крыж, Ісусе, зышоўшы з нябёсаў; Ты прыйшоў на сьмерць, Жыцьцё несьмяротнае. Для тых, што ў цемры, Ты стаўся праўдзівым сьвятлом; для тых, што ўпалі, Ты ўваскрасеньне і прасьвятленьне. Збавіцелю наш, слава Табе!

*Верш.* Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу. Апрануўся Госпад у сілу і падперазаўся.

Усхвалім у песьнях Хрыста, які ўваскрос з мёртвых. Прыняўшы душу і цела, Ён разлучыў іх падчас пакутаў. Ён зыйшоў сваёй пачэснай душой у пекла і паланіў яго, і ў магіле ня ўбачыла тленнасьці сьвятое цела Збаўцы душаў нашых.

*Верш.* Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца.

У псалмах і песьнях славім Тваё, Хрысьце, уваскрасеньне з мёртвых, якім Ты вызваліў нас ад пякельных мукаў і, як Бог, дараваў нам вечнае жыцьцё і багацьце Твайго зьмілаваньня.

*Верш.* Дому Твайму належыцца сьвятасьць, Госпадзе, праз усе дні.

Уладару ўсіх недасяжны, Творча неба і зямлі, Ты, на крыжы пацярпеўшы, мяне ад мукаў вызваліў; пахаваны, Ты ўваскрос у славе і ўсемагутнай рукою Адама ўваскрасіў. Слава Твайму трохдзённаму ўваскрасеньню, якім Ты дараваў нам вечнае жыцьцё і ачышчэньне грахоў, адзіны Чалавекалюбча!

*Багародзічны.* Чыстая Дзева, што Бога ў целе невыказна зачала, Маці Бога ўсявышняга, прымі маленьні слуг Тваіх, Усячыстая, дай ачышчэньне ад правінаў і, выслухаўшы малітвы слугаў Тваіх, маліся за збаўленьне душаў нашых.

**Адпушчальны трапар уваскросны**

***Увага:*** *Спосаб сьпяваньня трапароў у суботу ўвечары гл. ст. 5.*

Ты зышоў з вышыні, Міласэрны, пахаваньне прыняў трохдзённае, каб нас вызваліць ад цярпеньняў. Жыцьцё нашае і ўваскрасеньне, Госпадзе, слава Табе!

## НЯДЗЕЛЯ ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Ты, Госпадзе, прыйшоў на сьвет, каб паклікаць грэшнікаў і разбойнікаў, мытніка і блудніцу, і прыняць блуднага сына. Пакліч, Чалавекалюбча, і мяне, які зграшыў больш за іх і дасюль не раскаяўся.

Ты, Госпадзе, што мытніка паставіў пастырам Царквы Тваёй, а з ранейшага перасьледвальніка ўчыніў ейнага абаронцу, маліт-

вамі іх залічы мяне да ліку авечак Тваіх, каб я, нягодны, ня стаўся спажываю для ворага.

Плач, лютая душа мая, перад канцом тваім і прыхіліся, няшчасная, да Бога. Уздыхай з глыбіні сэрца і кліч: "Зграшыла я супраць Цябе, Хрысьце, але Ты ў міласэрнасьці Тваёй не пагардзі мною, малю Цябе, і, навярнуўшы, зрабі мяне вартаю прабачэньня."

*Багародзічны.* Увесь час я, стварэньне, зьневажаю і гняўлю Творцу майго: дай мне, Дзева, паправу, каб з Тваёй дапамогаю я рабіў справы, прыемныя Богу і атрымаў збаўленьне і адпушчэньне грахоў.

**Вершапесьні**

Цябе, Уладара і Госпада, анёлы няспынна славяць, а я, як мытнік, прыходжу да Цябе і клічу: "Божа, ачысьці мяне, грэшнага."

Душа мая, ты — несьмяротная, дык не пакрывайся хвалямі жыцьцёвых клопатаў, але ўстань і ўсклікні твайму Дабрачынцу: "Божа, ачысьці і збаў мяне!"

Гасподнія мучанікі, вы кожнае месца асьвячаеце і ўсякую немач аздараўляеце, дык молім вас: "Маліцеся, каб вызваліцца ад варожых сецяў душам нашым."

*Багародзічны.* Радуйся, Хорам адухоўлены, Галубка духоўная! Радуйся, Горадзе Творцы Твайго! Радуйся, Прытулак бясьпечны верных і Ахова, Заступніца тых, што любяць Цябе, Збаўленьне і Вызваленьне! Радуйся, Мост, што ўсіх пераводзіць да неба. Радуйся, адухоўленая сьвятая Уладарка!

## ПАНЯДЗЕЛАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Ня маю сардэчнай скрухі, ні крыніцы сьлёзаў, ні шчырага жалю за грахі, ні плачу, што абмывае, ні пакоры. Не пераймаў я мытніка, ні блудніцы, ні блуднага сына: дык як я знайду прабачэньне маіх бязьлікіх грахоў? Але Ты, Хрысьце, ведамымі Табе шляхамі збаў мяне.

Я адышоў далёка ад усіх боскіх прыказаньняў, ня дбаў пра сумленнасьць і змарнаваў жыцьцё маё, жывучы ў блудзе і

беззаконьні. Але Ты, **Хрысьце, у ласкавасьці Тваёй, зьмілуйся** нада мною і збаў мяне.

У гневе Тваім, Чалавекалюбча, не карай мяне — твор рук Тваёй дабрыні, — хоць я і аддаліўся ў маёй бяздумнасьці ад Цябе, які ласкава захацеў упадобніцца да мяне ў вялікай дабрасардэчнасьці Тваёй. Малітвамі Тваёй, Слова, Маці і заўсёды Дзевы зрабі мяне годным, Богжа, навярнуцца да Цябе.

*Багародзічны.* З вераю прыбягаю пад Тваё покрыва, Багародзіца чыстая: ад напасьцяў, бедаў, благіх пажаданьняў і д'ябальскай злосьці збаў мяне. Ты, Уладарка — глыбіня міласэрнасьці і хадайніца збаўленьня, бо Ты нарадзіла Бога міласэрнага, адзінага шчодрага і дабрасардэчнага.

**Вершапесьні**

Цябе, Уладара і Госпада, анёлы няспынна славяць, а я, як мытнік, прыходжу да Цябе і клічу: "Божа, ачысьці мяне, грэшнага."

Душа мая, ты — несьмяротная, дык не пакрывайся хвалямі жыцьцёвых клопатаў, але ўстань і ўсклікні твайму Дабрачынцу: "Божа, ачысьці і збаў мяне!"

Мучанікі Гасподнія, просім вас, маліце Бога нашага і выпрасіце душам нашым багацьце дабротаў і ачышчэньне ад шматлікіх правінаў.

*Багародзічны.* Радуйся, сусьветная пахвала; радуйся, сьвятыня Гасподняя; радуйся, гара ацененая; радуйся, усіх прыстанішча; радуйся, залаты ліхтар; радуйся, пачэсная слава верных; радуйся, Марыя, Маці Хрыста Бога; радуйся, раю; радуйся Боскі стал і залаты посуд; радуйся, надзея ўсіх.

## АЎТОРАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Калі Цябе ўкрыжавалі, прабіўшы рукі і ногі і пракалоўшы бок, Ты, Усядобры, выліў мне струмені боскага збаўленьня — кроў і ваду, — каб абмыць мой бруд і брыдоту. Слава, Шчодры, дабрыні Тваёй!

Ты, Уладару, быў замучаны, каб дараваць бясстраснасьць усім, што пакланяюцца Тваім пакутам, дабравольнай ахвяры,

кап'ю, цьвікам і трысьціне, якія Ты, Госпадзе, з сваёй волі выцярпеў, каб імі прыдбаць мне несьмяротнасьць.

Беззаганная авечка, калі ўбачыла на дрэве дабравольна паднесенае Ягнё, з плачам жалобна клікала: "Гора мне, любы Сыне! Што ўчыніла Табе нязбожнае зборышча, хочучы асіраціць мяне, Мілы мой?"

*Крыжабагародзічны.* Калі Чыстая Дзева ўбачыла, як вялі Цябе, быццам ягнё, на ахвяру, Яна пайшла за Табою, Слова, і са сьлязьмі клікала: "Куды сьпяшаешся, Сыне мой? Іду з Табою, наймілейшы, бо не магу быць без Цябе, Ісусе мой міласэрны."

**Вершапесьні**

Узьнесены на крыжы, Ты, Хрысьце Божа, збавіў род людзкі: славім цярпеньні Твае.

Ты, Хрысьце Божа, быў прыбіты да крыжа і адчыніў нам дзьверы райскія: славім боства Тваё.

Мучанікі Твае, Госпадзе, забыліся пра жыцьцёвыя клопаты, не зважалі на мукі дзеля будучага жыцьця і, стаўшыся яго спадкаемцамі, радуюцца разам з анёламі. Малітвамі іх дай людзям Тваім веліч зьмілаваньня .

*Крыжабагародзічны.* Калі сонца ўбачыла, як Ты, Сонца праведнасьці, Госпадзе, вісіш на крыжы, яно схавала промні свае, месяц сьвятло на цемру перамяніў, і боль працяў сэрца Маці Тваёй.

## СЕРАДА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Ты, Госпадзе, прасьвятліў апосталаў зьзяньнем Пацяшыцеля і сьвятлом мудрасьці Тваёй, і паставіў іх сьветачамі для ўмацаваньня веры ўсіх; дзеля гэтага пакланяемся невыказнаму чалавекалюбству Твайму.

Ты, Госпадзе, малітвамі апосталаў захаваў бясьпечным ад варожых спакусаў статак Твой, які Ты выкупіў пачэснай крывёю сваёю з няволі д'ябальскай у дабрыні Тваёй і чалавекалюбстве.

Вы зьявіліся на скляпеньні царкоўным быццам самацьветы, што сьвецяць на ўвесь сьвет зьзяньнем богапазнаньня, боскія апосталы. Цяпер вы стаіце перад пасадам Тройцы і моліцеся за душы нашыя.

*Багародзічны.* Глянь на ўздыханьні майго скрушлівага сэрца, Боганявеста; прымі, Чыстая Дзева Марыя, рук маіх уздыманьне, і ў чалавекалюбстве Тваім не адкінь мяне, Беззаганная, каб мне славіць і ўзьвялічваць Цябе, якая ўзьвялічыла род наш.

**Вершапесьні**

Апосталы на зямлі сардэчна палюбілі Цябе, Госпадзе, за ніштo палічылі ўсё іншае, каб толькі з Табою быць, і за Цябе целы свае аддалі на мукі; цяпер, будучы праслаўленымі, яны моляцца за душы нашыя.

Ты, Госпадзе, узьвялічыў на зямлі памяць апосталаў; дзеля гэтага мы ўсе, зышоўшыся разам, славім Цябе, бо Ты малітвамі іх даеш нам збаўленьне і даруеш усяму сьвету веліч зьмілаваньня.

Калі ёсьць якая дабрадзейнасьць і пахвала, дык належыць яна сьвятым: яны схілілі шыі свае пад меч дзеля Цябе, які нахіліў неба і зышоў да нас; кроў пралілі сваю дзеля Цябе, які спустошыў сябе дзеля нас, прыняўшы выгляд слугі; упакорыліся аж да сьмерці, прыпадабняючыся ўбоству Твайму. Малітвамі іх, у мностве міласэрнасьці Тваёй, зьмілуйся над намі.

*Багародзічны.* Пад Тваю апеку прыбвягаю, усесьвятая Багародзіца Дзева, і прашу збаўленьня, бо ведаю, што Ты, Чыстая, можаш дапамагчы мне.

## ЧАЦЬВЕР УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Слаўны цуд! Жыцьцядайнае дрэва — крыж сьвяты, — узносіцца сёньня на вышыню. Славяць яго ўсе канцы зямлі і ў страху дрыжаць дэманы. Які вялікі дар быў дадзены людзям! Збаў ім душы нашыя, Хрысьце, адзіны Дабрасардэчны.

Слаўны цуд! Быццам поўная жыцьця вінаградная гронка, сёньня бачна ўзносіцца над зямлёю крыж, што насіў на сабе Ўсявышняга: мы ўсе ім да Бога прыцягваемся, і сьмерць да канца перамагаецца. О пачэснае дрэва! Праз цябе мы атрымалі райскі плод несьмяротнасьці — Хрыста.

Вялікая любоў Твая да нас, добры Ісусе! Ты ўпакорыў сябе, стаўся чалавекам, і дабравольна пацярпеў на крыжы ганебную сьмерць за нягодных слугаў Тваіх. Які годны Бога дар Табе прынясем? Хіба што з удзячнасьцю будзем верна славіць Цябе.

*Крыжабагародзічны.* Бачачы, як Ты, Ісусе, быў прыбіты да крыжа і дабравольна прыняў мукі, Дзева і Маці Твая, Уладару, усклікнула з плачам: "Гора мне, Дзіця маё любае! Як гэта церпіш несправядлівыя мукі Ты, што аздараўляеш людзкія немачы і ад тленнасьці збаўляеш усіх у міласэрнасьці Тваёй?"

**Вершапесьні**

Узьнесены на крыжы, Ты, Хрысьце Божа, збавіў род людзкі. Славім цярпеньні Твае.

Ты, Хрысьце Божа, быў прыбіты да крыжа і адчыніў нам дзьверы райскія. Славім боства Тваё.

Мучанікі Гасподнія, вы кожнае месца асьвячаеце і ўсялякую немач аздараўляеце. Дык просім вас, маліцеся, каб ад варожых сецяў вызваліцца душам нашым.

*Крыжабагародзічны.* Сонца, убачыўшы, як Ты, Сонца праведнасьці, Госпадзе, вісіш на крыжы, схавала промні свае, месяц сьвятло на цемру перамяніў, і боль працяў сэрца Маці Тваёй.

## ПЯТНІЦА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Стрэлы ворага раняць няспынна мяне, няшчаснага, і ня ведаю, што рабіць. Вы ж, мужна пацярпеўшы, зьнішчылі ягоныя стрэлы, і струменямі крыві вашай прасьвятляеце ўсё стварэньне. Дык аздаравіце, боскія мучанікі, і мяне, немачнага, бо маеце, блаславёныя, давер у Госпада.

Калі падумаю пра страшны час выпрабаваньня майго Табою, Судзьдзёй усіх і Госпадам, поўнюся страхам, плачу жаласна і сумую, згадваючы веліч маёй нягоднасьці. Але Ты, Чалавекалюбча, у добрасардэчнасьці Тваёй вызваль мяне ад мукі малітвамі мучанікаў Тваіх.

Боскія мучанікі, маліцеся Богу за тых, што з вераю шануюць вашую сьвятую памяць, каб вызваліцца ім ад спакусы і атрымаць нябеснае жыцьцё — якое прыгатаваў адзіны Дабрачынца і доўгацярплівы Чалавекалюбец, — дзе хоры патрыярхаў заўжды ў радасьці прабываюць.

*Дагматык.* Уладар нябесны дзеля любові да людзей... *(Гл. ст.61)*

**Вершапесьні**

Мучанікі Тваe, Госпадзе, забыўшыся пра ўсё дачаснае, не зважалі на мукі дзеля будучага жыцьця, якое атрымалі ў спадчыне, і цяпер прабываюць у радасьці разам з анёламі. Малітвамі іх дай людзям Тваім веліч зьмілаваньня Твайго.

Мучанікі Гасподнія, просім вас, маліце Бога нашага і выпрасіце душам нашым багацьце дабротаў і ачышчэньне ад шматлікіх правінаў.

Мучанікі Хрыстовыя неператможныя, вы зьнішчылі ману сілаю крыжа і атрымалі ласку вечнага жыцьця. Не спалохаўшыся пагрозаў мучыцеляў, у цярпеньнях вы цешыліся, а цяпер кроў вашая сталася аздараўленьнем для душаў нашых. Маліцеся каб душам нашым атрымаць збаўленьне.

*Багародзічны.* Прымі, Уладарка, маленьні слугаў Тваіх і вызваль нас ад усякай бяды і суму.

## БАГАРОДЗІЧНЫЯ НЯДЗЕЛЬНЫЯ АДПУШЧАЛЬНЫЯ

*Тон 1.* Як толькі пачуўся голас Габрыеля, які казаў Табе, Дзева:"Радуйся!", Уладар усіх узяў цела ад Цябе, сьвятая Скарбніца, як прадказаў праведны Давід. Ты сталася больш прасторнай за неба, бо насіла ў сабе Творцу ўсяго. Слава Таму, хто пасяліўся ў Табе; слава Таму, хто выйшаў з Цябе; слава Таму, хто вызваліў нас нараджэньнем сваім.

*Тон 2.* Вышэй за розум усяслаўныя тайны Твае, Багародзіца: зьбярогшы чысьціню і захаваўшы дзявоцтва, Ты несумненна сталася Маці, нарадзіўшы Бога праўдзівага. Малі Яго за збаўленьне душ нашых.

*Тон 3.* Цябе, Хадайніцу за збаўленьне наша, славім, Багародзіца Дзева, бо целам, якое Ён узяў ад Цябе, Сын Твой і Бог наш на крыжы пацярпеў і як Чалавекалюбец ад тленнасьці выбавіў нас.

*Тон 4.* Тайна, спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая, праз Цябе, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і пацярпеўшы дзеля нас дабравольна на крыжы, уваскрасіў ім першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашыя.

*Тон 5.* Ты — Сьвятыня і Брама, Хорам і Пасад Уладара, Дзева ўсячыстая: Табою Збаўца мой Хрыстос Бог зьявіўся тым, што сядзелі ў цемры. Будучы Сонцам праведнасьці, Ён захацеў прасьвятліць тых, каго Ён рукою сваёю стварыў на вобраз свой. Дзеля гэтага, Усяхвальная, маючы матчыну ласку ў Яго, маліся няспынна за збаўленьне душаў нашых.

*Тон 6.* Ты, што назваў Маці Тваю блаславёнаю, аддаў сябе дабравольна на мукі і зазьзяў на крыжы, каб знайсьці Адама і сказаць анёлам: "Радуйцеся са Мною, бо Я знайшоў згубленую драхму." Божа, што ўсё мудра ўладкаваў, слава Табе!

*Тон 7.* Скарбніца нашага ўваскрасеньня, Усяхвальная, што, нарадзіўшы Збаўцу, вызваліла падуладных граху, — выратуй тых, што спадзяюцца на Цябе, з бяздоннай ямы правінаў — Ты, якая перад родамі была Дзеваю, і падчас родаў Дзеваю, і пасьля родаў Дзеваю засталася.

*Тон 8.* Ты, што дзеля нас нарадзіўся ад Дзевы і на крыжы пацярпеў, сьмерцю зьнішчыў сьмерць і явіў сябе Богам ва ўваскрасеньні, не пагардзі творамі рук Тваіх, пакажы чалавекалюбства Тваё, Міласэрны, прымі малітвы за нас Багародзіцы, якая нарадзіла Цябе, і збаў, Збавіцелю добры наш, людзей бездапаможных.

ЗЬМЕСТ


| | Стар. |
|---|---|
| Тон 1 | 3 |
| Тон 2 | 11 |
| Тон 3 | 19 |
| Тон 4 | 27 |
| Тон 5 | 36 |
| Тон 6 | 46 |
| Тон 7 | 53 |
| Тон 8 | 61 |
| Багародзічныя нядзельныя адпушчальныя | 69 |